## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ЗАСТРОЙЩИКА ОТ 27.09.2011

**Сведения о застройщике:** Совместное общество с ограниченной ответственностью «Лада ОМС-Инжениринг» (СООО «Лада ОМС-Инжениринг»). СООО «Лада ОМС-Инжениринг» является универсальным правопреемником СП «Лада ОМС-Холдинг» ЗАО.

**Местонахождение:** г. Минск, ул. Грушевская, 91, пом. 2Н, комн. 3а.

**Режим работы:** рабочие дни с понедельника по пятницу с 8.30 до 17.30; выходной день – суббота, воскресенье.

**Данные о государственной регистрации:** зарегистрировано Минским горисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №191118730.

**Сведения о проектах жилых домов,** введенных в эксплуатацию за последние 5 лет:

1. 9-этажный 5-секционный 175-квартирный жилой дом № 91 на ул. Грушевской в г. Минске.
2. 15-17-этажный односекционный 82-квартирный жилой дом № 15 на ул. Маяковского в г. Минске со встроенно-пристроенными помещениями подземного гаража-стоянки, магазина и аптеки.
3. 7-этажный 5-секционный 135-квартирный жилой дом № 3 на ул. Щорса.
4. 15-этажный односекционный 89-квартирный жилой дом № 8 на 3-й ул. Щорса.

**Цель проекта** – строительство объекта «Комплекс многоэтажных жилых домов с объектами общественного назначения на территории в границах ул. Маяковского, ул. Оранжерейной, ул. Луговой, пер. Полевой со сносом существующей усадебной жилой застройки в границах ул. Маяковского, ул. Аранской, ул. Денисовской, р. Свислочь и выделением 1-й очереди – многоэтажный жилой дом со встроенно-пристроенными объектами административно-общественного назначения. Жилой дом № 5 по генплану» (1-й пусковой этап) с привлечением денежных средств граждан и юридических лиц путем заключения договоров создания объектов долевого строительства.

**Сведения о сроках реализации:**

Начало строительства – май 2011 г.

Ввод объекта в эксплуатацию – первое полугодие 2013 г.

У Застройщика имеются:

- решение Мингорисполкома о разрешении строительства от 24.03.2011 № 731;

- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу в РУП «Главгосстройэкспертиза» (заключение от 04.10.2010 № 1085-15/10).

**Местонахождение строящегося объекта**: г. Минск, территория в границах ул. Маяковского, ул. Оранжерейной, ул. Луговой, пер. Полевой.

**Количество предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства.**

Административное и торговое помещение (1246,45 кв.м).

**Цена одного квадратного метра** общей площади нежилых помещений (без отделки) составляет 946,32 USD, с оплатой белорусскими рублями по курсу Национального банка Республики Беларусь, на дату оплаты.

**Данные о правах застройщика на земельный участок:** земельный участок предоставлен застройщику решением Мингорисполкома от 24.03.2011 № 731 площадью 0,3737 га.

**Элементы благоустройства:** создаются площадки для отдыха, детская площадка, газоны, озеленение; покрытие проездов к дому – двухслойный асфальтобетон, тротуаров – мелкоразмерная плитка, дорожек и площадок – спецсмесь и плитка.

**Предполагаемый срок ввода дома в эксплуатацию –** первое полугодие 2013 г.

**Сведения о договорах строительного подряда:**

договор подряда с СООО «Гранитстройинвест» от 28.03.2011 № 28-03/1.

**Условия ознакомления с информацией по проекту:**

тел.: 8 017 220 40 43, VELCOM 8 029 699 40 32; на сайте http://www. lada-park.by/ либо по адресу: г. Минск, ул. Грушевская, 91, пом. 2Н, комн. 3а.

## ГОРАД ДАПАМАГАЕ ВЁСЦЫ

**У Магілёўскай вобласці ў выхадныя дні адбыўся суботнік. У ім бралі ўдзел каля 20 тысяч магілёўцаў, уключаючы і прадстаўнікоў улады.**

Людзі працавалі на ўборцы ўраджаю ў бліжэйшых сельскіх раёнах, прычым асноўныя сілы былі накіраваны на працу ў Шклоўскім раёне. Убіралі з палёў бульбу, гародніну, лён. Мяркуецца, што на тыдні аграрыі зноў запросяць гараджан на ўборачныя работы.

**Ілона ІВАНОВА.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
### по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

| | |
|---|---|
| **Наименование предмета аукциона** | **Капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка** |
| **Местонахождение недвижимого имущества** | Брестская обл., Ивацевичский р-н, д. Нехачево |
| **Продавец недвижимого имущества** | РСУП «Брестплемпредприятие», тел. (0162) 23 26 07 |
| **Сведения о предмете аукциона** | Здание 1-эт., с холодной пристройкой, кирпичное, 1965 г.п., площадь – 38,8 кв.м. Земельный участок площадью 0,1091 га с ограничениями в использовании земель на площади 0,0042 га и 0,0398 га в охранных зонах линий электропередачи использовать для строительства производственных объектов, объектов общественного питания и торговли, объектов по оказанию услуг; срок аренды – 50 лет |
| **Начальная цена предмета аукциона, руб.** | 4 406 400 |
| **Сумма задатка, руб.** | 440 000 |
| **Организатор аукциона** | **Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 23 12 63, 20 87 85, 23 44 78, www.brest-region.by** |

Аукцион состоится **28 октября 2011 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

**Для участия в аукционе представляются***:*

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».
2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 ГФ по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538; срок внесения суммы задатка – **по 27 октября 2011 г. включительно.**
3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.
4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.
5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.
6. Консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе; сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.
7. Уполномоченным лицом консолидированных участников (его представителем) – доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе.
8. Представителем заявителя, уполномоченного лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель), уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан:

подписать протокол аукциона в день аукциона;

в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка; внести в местный бюджет плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) за право заключения договора аренды земельного участка, после чего не позднее 2-х рабочих дней заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 года № 462.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, 413 фонд «Брестоблимущество» по рабочим дням с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по 27 октября 2011 года включительно.**

## У БЕЛАРУСІ З 1 СТУДЗЕНЯ СПРАШЧАЕЦЦА ПАРАДАК ПРАДАСТАЎЛЕННЯ ЗЯМЕЛЬ ДЛЯ БУДАЎНІЦТВА АБ'ЕКТАЎ ПРЫДАРОЖНАГА СЭРВІСУ

**У Беларусі з 1 студзеня 2012 года спрашчаецца парадак прадастаўлення зямель для будаўніцтва аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу. Адпаведны ўказ № 431 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні адносін у галіне адабрання, прадастаўлення і выкарыстання зямельных участкаў» Прэзідэнт Беларусі падпісаў 23 верасня.**

Указ падпісаны ў мэтах удасканалення рэгулявання адносін у галіне аховы і выкарыстання зямель. Ён накіраваны на рэалізацыю асобных палажэнняў Дырэктывы № 4 «Аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы і стымуляванні дзелавой актыўнасці ў Рэспубліцы Беларусь». Размова ідзе аб спрашчэнні парадку прадастаўлення зямель для рэалізацыі інвестпраектаў, а таксама карэкціроўцы шэрагу нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць зямельныя адносіны.

Так, зямельныя ўчасткі для будаўніцтва і абслугоўвання аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу будуць прадастаўляцца без правядзення аўкцыёнаў. Пры гэтым кампетэнцыя па адабранні і прадастаўленні ўчасткаў для будаўніцтва названых аб'ектаў перадаецца ад абласных выканкамаў раённым.

Грамадзянам дадзена права выкарыстоўваць зямельныя ўчасткі, прадастаўленыя для будаўніцтва і (або) абслугоўвання жылога дома, вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, без змянення іх мэтавага прызначэння таксама і для рамеснай дзейнасці, аказання паслуг у сферы аграэкатурызму, іншай прадпрымальніцкай дзейнасці.

Недзяржаўным юрыдычным асобам прадастаўлена права набываць у прыватную ўласнасць зямельныя ўчасткі, раней прадастаўленыя ў карыстанне для абслугоўвання прыналежных ім капітальных будынкаў, па цане, роўнай 70 працэнтам ад іх кадастравага кошту.

Указ таксама абавязвае мясцовыя выканкамы выстаўляць на аўкцыёны па продажы зямельных участкаў у прыватную ўласнасць для будаўніцтва і абслугоўвання аднакватэрных, блакіраваных жылых дамоў не менш за 30 працэнтаў зямельных участкаў, уключаных у пералікі свабодных (незанятых) зямельных участкаў.

У дакуменце замацаваны розныя ўмовы прадастаўлення зямельных участкаў для індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва і вызначэння кошту такіх участкаў для розных катэгорый насельніцтва. Так, шматдзетным сем'ям, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, зямельныя ўчасткі будуць прадастаўляцца ва ўласнасць бясплатна. Іншыя грамадзяне, якія працяглы час знаходзяцца на такім уліку і якія не маюць ва ўласнасці аб'ектаў нерухомай маёмасці, змогуць атрымаць зямлю ў прыватную ўласнасць з унясеннем платы ў памеры 20 працэнтаў ад кадастравага кошту або ў пажыццёвае спадчыннае валоданне.

У мэтах прадухілення магчымых выпадкаў перапродажу зямлі, атрыманай на льготных умовах, указам уводзіцца абмежаванне права грамадзян, якія атрымалі зямельныя ўчасткі як маючыя патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, адчужаць такія ўчасткі да заканчэння васьмі гадоў з дня дзяржаўнай рэгістрацыі збудаваных на іх жылых дамоў (за выключэннем адчужэння мясцовым выканкамам).

У адпаведнасці з указам Савету Міністраў даручана вызначыць адзіны парадак уліку грамадзян, якія жадаюць атрымаць зямельныя ўчасткі для будаўніцтва і абслугоўвання аднакватэрных, блакіраваных жылых дамоў.

Указ уступае ў сілу з 1 студзеня 2012 года.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Абзац

◢ У гандлёвым абслугоўванні ўдзельнікаў і гасцей фестывалю-кірмашу працаўнікоў сяла «Дажынкі-2011» у Маладзечне будуць задзейнічаны 300 арганізацый гандлю, грамадскага харчавання, а таксама 65 індывідуальных прадпрымальнікаў і 500 майстроў народных рамёстваў. Даўжыня гандлёвых радоў складзе больш за 7 км.

◢ **Гродзенскія выратавальнікі вызвалілі з вентыляцыйнай шахты 17-гадовага хлопца. МНС выклікалі жыхары адной з кватэр на 11-м паверсе, якія пачулі крыкі аб дапамозе. Выратавальнікам прыйшлося выпілоўваць кавалак сцяны на кухні, каб выцягнуць маладога чалавека з шахты. У выніку падзення хлопец атрымаў раненні рук і ног. Падлетак пракраўся на тэхнічны паверх з сябрам, але спатыкнуўся і праваліўся ў вентыляцыйную шахту памерамі 0,5х0,4 м.**

◢ Гаспадаркі Беларусі завяршаюць уборку грэчкі. Яна ўбрана на 96% пасеянай плошчы. На 25 верасня ў цэлым па рэспубліцы ўбрана 54,2 тыс.т грэчкі з запланаваных на гэты год каля 40 тыс.т. Летась на аналагічную дату было сабрана 21,3 тыс.т. У сярэднім атрымліваюць па 15,2 ц/га, што на 5 ц больш, чым у аналагічны леташні перыяд. Сёлета значна павышана зацікаўленасць гаспадарак, якія вырошчваюць грэчку. Закупачныя цэны выраслі амаль на 70%. Грэчка, прызначаная для перапрацоўкі на крупы (1-га класа), павялічылася ў кошце на 67,8% да Br2 млн 900 тыс. за тону, 2-га — на 68,3% да Br2 млн 700 тыс., 3-га — на 66,9% да Br2 млн 400 тыс.

◢ **За мінулую пятніцу і выхадныя на дарогах Беларусі загінулі 16 пешаходаў і 3 веласіпедысты. 24 верасня ў дзённы час у вёсцы Зграйкі Валожынскага раёна 6-гадовая дзяўчынка выбегла на праезную частку і трапіла пад аўтамабіль. Дзіця загінула на месцы. У той жа дзень у вёсцы Далёкія Лідскага раёна раніцай аўтобус «Радзіміч» насмерць збіў 24-гадовага жыхара Ліды, які пераходзіў дарогу па-за пешаходным пераходам. Увечары 25 верасня ў вёсцы Моладава Іванаўскага раёна аўтамабіль збіў 23-гадовага мясцовага жыхара, які сядзеў на дарозе. Ад атрыманых траўмаў ён памёр на месцы.**

◢ Аб'ём нарыхтаваных журавін і брусніц кааператарамі Віцебскай вобласці сёлета вырас у 12 разоў у параўнанні з мінулым годам. Актыўнымі тэмпамі ідзе нарыхтоўка грыбоў. Іх запасы ўжо ў 2,6 раза перавышаюць леташнія. Кааператары вобласці выплацілі насельніцтву за здадзеную сельгаспрадукцыю, дзікарослыя ягады і грыбы Br60,5 млрд. Гэта больш чым на 20% у параўнанні з леташнім перыядам.

◢ **Турцыя павялічыла аб'ём імпарту беларускіх турпаслуг. Турысты з Турцыі, акрамя ўсяго, прыязджаюць у Беларусь пагуляць у казіно і залах гульнявых аўтаматаў, паколькі ў іх краіне азартныя гульні забаронены. У той жа час каля 70% замежных турыстаў у Беларусі — грамадзяне суседніх з нашай рэспублікай краін. У ліку лідараў па імпарце беларускіх турпаслуг значацца Літва, Украіна і Расія. Таксама шмат інтурыстаў прыязджае ў Беларусь з Германіі.**

### Поўны абзац

◢ Студэнты-рэспубліканцы з Каліфарнійскага ўніверсітэта ў Берклі правядуць распродаж выпечкі, прызначаючы кошт у залежнасці ад расы і полу пакупніка. Акцыя адбудзецца ў знак пратэсту супраць законапраекта, які дазволіць каліфарнійскім універсітэтам улічваць гэтыя звесткі пры залічэнні студэнтаў.

◢ **Амерыканец Энтані Портэр, які пазбегнуў смяротнага пакарання ў 1998 годзе, быў арыштаваны па падазрэнні ў крадзяжы чатырох флаконаў дэзадаранту з крамы. Портэр правёў у турме 17 гадоў, яго прызналі вінаватым у двайным забойстве, аднак высветлілася, што адбылася памылка. Яго справа паўплывала на рашэнне адмяніць у штаце смяротнае пакаранне.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## Спорт-тайм

### ШОСТЫ ТУР ЗАПАР «ШАХЦЁР» НЕ МОЖА ВЫЙГРАЦЬ

**У нядзелю ў чэмпіянаце Беларусі па футболе адбыліся пяць матчаў. Адкрываў жа ў пятніцу 26-ы тур паядынак паміж барысаўскім БАТЭ і бабруйскай «Белшынай».**

Ужо ў сераду нашаму лідару ў межах Лігі чэмпіёнаў сустракацца з «Барселонай», таму нічога дзіўнага, што ў чэмпіянаце БАТЭ вырашыў зэканоміць сілы. Тым больш што адставанне астатніх каманд ад барысаўскага клуба такое, што можна сабе гэта дазволіць. «Белшына» — БАТЭ — 1:1 (Зубовіч, 46 — Канцавы, 6). БАТЭ застаецца на першым месцы, і адставанне ад найбліжэйшага праследавацеля, «Шахцёра», застаецца камфортным — 11 ачкоў.

А вось «Шахцёру» расслабляцца зараз не час: канкурэнты шчыльна падабраліся да віцэ-чэмпіёна ў турнірнай табліцы. А салігорская каманда адна за адной выдае нічыі. У гэтым туры таксама — 0:0 у паядынку з «Нёманам». Гэта шостая нічыя запар у чэмпіянаце, а калі яшчэ ўзгадаць і кубкавую сустрэчу на мінулым тыдні, то сёмая. Галоўны трэнер Уладзімір Журавель скардзіцца на медыцынскі персанал, бо каманда ператварылася ў лазарэт. Але як бы там ні было, трэнерскаму штабу нешта тэрмінова трэба мяняць у салігорскай дружыне. У наступным туры «Гомель», які адстае на адно ачко, і мінскае «Дынама» (адстае на два) могуць і абысці «Шахцёр».

Тым больш што і «Гомель», і «Дынама» набралі неблагі тэмп і ў туры зноў атрымалі перамогі: «Гомель» над «Мінскам» (1:0), а «Дынама» — над «Дняпром» (4:1). Непрыемны эпізод здарыўся, дарэчы, на стадыёне ў Кунцаўшчыне. Міліцыя была вымушана ўмяшацца ў разборкі паміж мінскімі і магілёўскімі балельшчыкамі. Некалькі «фанатаў» было дастаўлена ў Фрунзенскі РУУС сталіцы.

Вось вынікі астатніх матчаў: «Нафтан» — «Віцебск» — 1:1, «Тарпеда-БелАЗ» — «Дынама» (Брэст) — 1:2. Турнірная табліца пасля 26 тураў выглядае так: 1. БАТЭ — 54 ачкі; 2. «Шахцёр» — 43; 3. «Гомель» — 42; 4. «Дынама» Мн — 41; 5. «Белшына» — 35; 6. «Дынама» Бр — 32; 7. «Тарпеда-БелАЗ» — 32; 8. «Нафтан» — 31; 9. «Мінск» — 29; 10. «Віцебск» — 28; 11. «Нёман» — 25; 12. «Днепр» — 21.

### «ДЫНАМА» САСТУПІЛА ЦСКА Ў ЧЭМПІЯНАЦЕ КХЛ

**У чарговым матчы КХЛ 25 верасня мінскае «Дынама» прайграла ў Маскве ЦСКА — 0:2. Шайбы ў складзе суперніка закінулі Дзмітрый Моня і Сяргей Шырокаў.**

Пасля матча галоўны трэнер Марэк Сікора наракаў на акадэмічную гульню і паабяцаў перастаноўкі ў наступным матчы з піцерскім СКА.

— Для таго, каб абыгрываць такія каманды, як ЦСКА, патрэбны іншы настрой, больш жорсткія дзеянні, барацьба на пятаку. Мы згулялі нядрэнна, але занадта акадэмічна. Момантаў было нямала, але мы іх не рэалізавалі. Калі ў пачатку сустрэчы гульцы не настройваюцца, як трэба, перастроіцца потым вельмі складана. Будзем спадзявацца, што гэта паражэнне пойдзе нам на карысць... Магчыма, калі б нас судзілі арбітры па фігурным катанні, мы б перамаглі.

Такім чынам, пасля 7 матчаў мінскае «Дынама» з 11 ачкамі займае чацвёртае месца ў Заходняй канферэнцыі і другое — у дывізіёне Тарасава. У агульнай табліцы наш клуб на чацвёртым месцы сярод 23 клубаў. Але нераскрыты патэнцыял нашай каманды — у рэалізацыі момантаў, калі мы гуляем у большасці. Дынамаўцы пакуль ні разу не закінулі пасля выдалення гульцоў суперніка.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ТЕРРИТОРИАЛЬНЫЙ ФОНД ГОСУДАРСТВЕННОГО ИМУЩЕСТВА**
**извещает о проведении повторного аукциона с применением метода понижения начальной цены по продаже имущества республиканской собственности – 6 автотранспортных средств.**

Аукцион состоится **5 октября 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Либкнехта, 54/35 (актовый зал).

Продавец: Автотранспортное государственное учреждение «Белтрансспецавто» Управления делами Президента Республики Беларусь; 220004, г. Минск, ул. К. Либкнехта, 54/35, конт. тел.: 200 28 23, 226 46 78.

Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества; 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, конт. тел. 200 20 89.

На аукцион выставляются легковые автомобили, находящиеся на территории Продавца по адресу: г. Минск, ул. К. Либкнехта, 54/35:

| № лота | Полное наименование транспортных средств | Год выпуска | Инвентарный номер | Характеристики объектов республиканской собственности: номер кузова (шасси), цвет | пробег, тыс.км | объем двигателя, литров | краткое описание технического состояния | Начальная цена, рублей | Минимальная цена, рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ГАЗ -31029 | 1996 | 3170 | Т0492430, светло-серый | 223,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес; отсутствует: АКБ, щетки стеклоочистителя, коврики, колпаки колес, патрубки системы охлаждения, рукоятка рычага КПП, магнитола, подголовники задних сидений | 3 330 292 | 666 058 |
| 2 | ГАЗ -3102 00 | 1996 | 3095 | Т0049141, светло-серый | 292,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес; отсутствует: АКБ, щетки стеклоочистителя, коврики, антенна радио, боковое зеркало заднего вида (левое), фонарь подсветки заднего регистрационного знака, рукоятка рычага КПП, колпак колеса | 3 243 084 | 648 617 |
| 3 | ГАЗ -3102 00 | 1996 | 3133 | ХТН310200Т0053147, серо-белый | 275,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес; отсутствует: АКБ, щетки стеклоочистителя, коврики, подголовники передних сидений, рукоятка рычага КПП, трос капота и ручка его открытия, колпаки колес | 3 291 487 | 658 297 |
| 4 | ГАЗ -3102 00 | 1996 | 3172 | Т0058096, светло-серый | 294,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес, неисправен замок зажигания; отсутствует: АКБ, щетки стеклоочистителя, коврики, боковые повторители поворотов, колпаки колес | 3 243 084 | 648 617 |
| 5 | ГАЗ -310290 | 1996 | 3163 | Т0489757, черный | 170,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес; неисправен замок зажигания, повреждение центральной консоли; отсутствует: АКБ, щетки стеклоочистителя, коврики, внутренняя обшивка передней левой двери, магнитола, боковое зеркало заднего вида (правое), боковые повторители поворотов, рукоятка рычага КПП, колпаки колес | 3 330 292 | 666 058 |
| 6 | ГАЗ -310290 | 1996 | 3168 | Т0489482, серо-белый | 245,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес; отсутствует: АКБ, коврики, магнитола, рукоятка рычага КПП, подголовники сидений, боковой повторитель поворотов (правый), патрубки системы охлаждения, колпаки колес | 3 241 484 | 648 297 |

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты его проведения. Предмет торгов может быть снят с торгов по решению Продавца, Организатора аукциона, аукционной комиссии в любое время до объявления объекта проданным.

Участником аукциона до подачи заявления на участие в аукционе Организатору перечисляется задаток в размере 325 000 белорусских рублей на р/с 3642900000870 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, по рабочим дням с 9.00 до 17.00. Заявления принимаются с 27 сентября по 4 октября 2011 г. включительно.**

Извещение о проведении открытого аукциона опубликовано в газете «Звязда» 22.06.2011 № 115 (26979) и в газете «Вечерний Минск» 25.06.2011 № 71 (12374).

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику (претендент на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона (претендент на покупку) в течение 10 рабочих дней со дня утверждения Организатором аукциона протокола о результатах аукциона обязан возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации под роспись.

Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается не позднее 2 рабочих дней после возмещения вышеуказанных затрат.

Порядок и срок осмотра транспортных средств установлен и производится Продавцом по адресу: г. Минск, ул. К. Либкнехта, 54/35, с 09.00 до 18.00 по будним дням **по 4 октября 2011 г. включительно.**

Контактные тел.: (8017) 200 28 23; (8029) 677 88 87, Гундилович Сергей Сергеевич, Маилянц Владимир Гарриевич; 150 – внутренний номер в учреждении «Белтрансспецавто».

## **Минский районный исполнительный комитет** *27 октября 2011 г.* **проводит открытый** *аукцион* **по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе**

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Целевое назначение | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена земельного участка (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Горанский с/с, д. Новое Поле | 623681315101000244 | 0,1438 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 141 550 | 20 000 000 | 2 000 000 |
| 2 | Горанский с/с, д. Новое Поле | 623681315101000241 | 0,1488 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 169 629 | 19 000 000 | 1 900 000 |
| 3 | Горанский с/с, д. Новое Поле | 623681315101000245 | 0,1533 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 194 899 | 20 000 000 | 2 000 000 |
| 4 | Горанский с/с, д. Новое Поле | 623681315101000242 | 0,1533 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 194 899 | 20 000 000 | 2 000 000 |
| 5 | Горанский с/с, д. Новое Поле | 623681315101000243 | 0,1533 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 194 899 | 20 000 000 | 2 000 000 |
| 6 | Горанский с/с, д. Новое Поле | 623681315101000240 | 0,1533 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 194 899 | 20 000 000 | 2 000 000 |
| 7 | Крупицкий с/с, д. Вербники | 623683901101000076 | 0,1516 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 102 011 | 18 000 000 | 1 800 000 |
| 8 | Крупицкий с/с, д. Самуэлево | 623683908601000088 | 0,1743 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 102 011 | 23 000 000 | 2 300 000 |
| 9 | Лошанский с/с, аг. Лошаны, участок № 18 | 623684005601000214 | 0,1452 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 894 471 | 24 000 000 | 2 400 000 |
| 10 | Лошанский с/с, д. Бровки, участок № 51 | 623684001601000246 | 0,2420 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 894 471 | 35 000 000 | 3 500 000 |
| 11 | Михановичский с/с, д. Гребенка | 623684201601000055 | 0,2494 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 600 000 | 34 000 000 | 3 400 000 |
| 12 | Михановичский с/с, д. Плебанцы | 623684205601000121 | 0,2414 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 2 000 000 | 56 000 000 | 5 600 000 |
| 13 | Михановичский с/с, аг. Чуриловичи | 623684206601000300 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 2 000 000 | 53 000 000 | 5 300 000 |
| 14 | Петришковский с/с, д. Новашино | 623685707101000145 | 0,1529 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 70 000 | 27 000 000 | 2 700 000 |
| 15 | Петришковский с/с, д. Новашино | 623685707101000283 | 0,1550 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 70 000 | 27 000 000 | 2 700 000 |
| 16 | Петришковский с/с, д. Новашино | 623685707101000273 | 0,1498 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 70 000 | 26 000 000 | 2 600 000 |
| 17 | Петришковский с/с, д. Новашино | 623685707101000282 | 0,1541 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 70 000 | 27 000 000 | 2 700 000 |
| 18 | Роговский с/с, д. Кукелевщина | 623685810601000018 | 0,1505 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 910 000 | 9 000 000 | 900 000 |
| 19 | Юзуфовский с/с, д. Юзуфово | 623688209101000205 | 0,2348 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 84 000 | 21 000 000 | 2 100 000 |
| 20 | Юзуфовский с/с, д. Масловичи | 623688205601000172 | 0,1486 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 84 000 | 19 000 000 | 1 900 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **27.10.2011 г.** в 9.30. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **21.10.2011 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–6 перечисляется на расчетный счет № 3641900000150 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лоты 7–8 перечисляется на расчетный счет № 3641900000091 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052399, код платежа – 04901.

На Лоты 9–10 перечисляется на расчетный счет № 3641900000046 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600228670, код платежа – 04901.

На Лоты 11–13 перечисляется на расчетный счет № 3641900000105 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600303747, код платежа – 04901.

На Лоты 14–17 перечисляется на расчетный счет № 3600621130151 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052386, код платежа – 04901.

На Лот 18 перечисляется на расчетный счет № 3641900000059 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052358, код платежа – 04901.

На Лоты 19–20 перечисляется на расчетный счет № 3641900000147 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052332, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.
2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.
3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Жыццялюбы

# ЯК БАБА ЗІНА ВУЧЫЛА МЯНЕ ТКАЦЬ, А Я ЯЕ ФАТАГРАФАВАЦЬ...

**Увёску Горнае я прыехала на змярканні. Пакуль дзед Шура даіў карову, мы з Зінаідай Іванаўнай Белавушкай хуценька накрылі на стол. Пасля смачнай вячэры гаспадыня наказала мне ўзяць жменю карамелек і павяла ў святое святых — сваю другую хату на два пакойчыкі, адзін з якіх практычна цалкам займалі старыя самаробныя кросны. За песнямі і размовамі мы не прыкмецілі, як праткалі цэлую ноч.**



### «Заўтра прыбяруся, падфарбуюся, тады і сфатаграфуеш мяне прыгожай»

— Тку, колькі сябе памятаю, — кажа бабуля, хуценька перабіраючы худымі спрактыкаванымі рукамі рознакаляровыя ніткі. — Раней у вёсцы ўсе жылі са сваёй працы. У гулі не хадзілі надта. А тая дзяўчына, якая не мела натканага, лічылася няўмекай. Я табе, калі хочаш, заўтра пакажу свае посцілкі, настольнікі, дыванкі ды ручнікі... А таксама церніцу, якой некалі лён мяла, трапло, якім ачышчала валакно ад кастрыцы, грэбень, якім яго часала...

Як толькі баба Зіна ўгледзела, што я дастала з заплечніка фотаапарат, адразу ж прыпыніла свой расказ, захвалявалася:

— Не фатаграфуй мяне цяперака. Я лепш заўтра прыбяруся, падфарбуюся, тады і сфатаграфуеш прыгожай. Лепш вось садзіся, — саступае мне сваё месца, — паспрабуй накідваць у ніты ўзор. Ды не бойся, гэта не такі цяжкі воз, як здаецца.

Шчыра кажучы, першыя хвілін дзесяць я блытала панажы, націскаючы нагою не на тую педаль. Ды і чоўнік, які так грацыёзна лётаў у руках майстрыхі, мяне не слухаўся, блытаўся ў нітках, нацягнутых паміж вялікай і малой навойкамі. Адным словам, кросны не хацелі раскрываць мне сваіх сакрэтаў. Пэўна, адчувалі, што я тут зусім выпадковы чалавек.

— А сфатаграфуйце мяне на памяць за вашым ткацкім станком, — папрасіла я Зінаіду Іванаўну, калі ў мяне хоць збольшага пачало нешта атрымлівацца.

— Ды я ж не ўмею... — разгублена паціснула бабуля плячыма. — Якая на свеце работа ёсць, усялякую даводзілася рабіць. І на валах арала, і касіла, як любы мужчына, нават лапці сплесці магу... У мяне, каб ты ведала, ажно 42 гады 4 месяцы і 10 дзён калгаснага стажу. Я са сваёй кукурузай ездзіла нават у Мінск на выставу. У той год яна такая высокая вырасла, што зайдзі ў яе, выцягні руку ўверх, дык той рукі і не відаць. Гэта ж цяперака паліваюць кукурузу гэтымі трактарамі, а раней вазілі нам са свінарніка жыжу і мы вёдрамі палівалі кожнае каліўца. ...Чатыры разы мяне выбіралі дэпутатам сельскага Савета... Адным словам, шмат чаго ўмею, а вось фотаапарат у руках, больш як 70 гадоў пражыла, трымаць не прыйшлося...

...Некалькі падказак — і Зінаіда Іванаўна зрабіла першы ў сваім жыцці фотаздымак. Пасля чаго махнула рукой, села за свае любімыя кросны і заспявала. Песень, перапанапалася, баба Зіна ведае багата. У тым ліку і на роднай мове. Праўда, большасць з іх з ноткай суму, пра нешчаслівае каханне...

— Якое жыццё — такія і песні, — патлумачыла бабуля і слова за словам распавяла сваю гісторыю.

### «Саромелася сваёй беднасці, таму напісала, што выходжу замуж»

Аднойчы, калі маладзенькая Зіна вярталася дадому ад сястры з Армавіра, у цягніку да яе прыбязаўся нярускі салдат.

— Ён служыў у Асіповічах і ехаў з водпуску. Убачыў мяне і адразу кажа: «Я цябе ўкраду. У нас такі закон, што хлопец сабе жонку павінен украсці». Не ведаю, чым бы гэта ўсё скончылася, калі б не Барыс Кірылавіч Казлоў. Сімпатычны афіцэр, які на адным з прыпынкаў на хаду заскочыў у наш вагон.

Маладыя людзі адразу ж адно аднаму спадабаліся. Усю дарогу, пакуль ехалі, размаўлялі, смяяліся. ...Неяк жартам той афіцэр выцягнуў у дзяўчыны з кішэні паліто даведку з сельсавета і запісаў яе хатні адрас. Праз нейкі час Зіна атрымала ад яго ліст.

— Мне, вясковай дзяўчыне, было вельмі цяжка адказаць на той ліст, — узгадвае Зінаіда Іванаўна. — Але ж адказала. І пачалася перапіска. Не памятаю, як доўга яна цягнулася. Памятаю толькі, што аднойчы Барыс Кірылавіч напісаў, што будзе ехаць у водпуск і заедзе да мяне. Лепш бы ён заехаў і нічога не напісаў *(уздыхае)*. Бо я саромелася сваёй беднасці: маленькага дамка, накрытага мятай саломай і яловымі лапкамі, у сенях якога стаялі карова і парася... Карацей, паплакала я сама сабе і ў рэшце рэшт напісала яму, каб не заязджаў, бо я выходжу замуж...

### «Ты ж ведаеш, што мне за завіўкай няма калі даглядаць...»

Час ішоў сваёй чаргой. Зіна пакахала хлопца з суседняй вёскі. Пачуццё было ўзаемнае, але... Яго бацькі былі супраць...

— Раз той хлопец мне і кажа, што яму з нашай вёскі сватаюць дзяўчыну з вялікім домам на два пакоі, з хлевам, садам. Я падумала і кажу: «Гэта ж мая сяброўка. Яна з завіўкай, а ты ведаеш, што мне за завіўкай няма калі даглядаць».

Пасля той размовы, прызналася Зінаіда Іванаўна, у яе быў такі стан, што пайшла б замуж за любога, хто б пасватаўся. І сваты не прымусілі сябе чакаць...

> З Шурам мы пражылі разам 50 з лішнім гадоў. Маем дзве хаты, паднялі на ногі двух сыноў, вырасцілі вялікі сад, нават вінаград у нас сіні расце. Нам усе зайздросцяць. **Усякае ў жыцці было, але галоўнае не выносіць смецце з хаты.** І ўсё будзе добра.

— Пасля запоін я сустрэла свайго былога хлопца, які пачаў угаворваць мяне адмяніць вяселле. Маўляў, ён перадумаў і прыйдзе да мяне са сватамі. Але я адказала: «Табе патрэбна багатая нявеста. А Шура — такі ж гаротнік, як і я, сірата. Мы ў маім маленькім доме будзем як-небудзь жыць. А калі дамок паваліцца, паставім падпоркі. Калі ж і яны не ўтрымаюць, дык выкапаем зямлянку і будзем жыць».

— І не шкадуеце зараз?..

— Не, — не раздумваючы, выпаліла баба Зіна. — Шкадую толькі, што пакрыўдзіла Барыса Кірылавіча. Ён мяне выратаваў, а я яго падманула... А з Шурам мы пражылі разам 50 з лішнім гадоў. Маем дзве хаты, паднялі на ногі двух сыноў, вырасцілі вялікі сад, нават вінаград у нас сіні расце. Нам усе зайздросцяць. Усякае ў жыцці было, але галоўнае не выносіць смецце з хаты. І ўсё будзе добра.

### «Партыйны білет тата паспеў кінуць мне за сукенку»

Слова за слова... Як высветлілася, баба Зіна памятае і першы дзень вайны.

— Мама мая была свінаркай у калгасе «Чырвоны пуцілавец». 22 чэрвеня яна карміла свіней, і я там гуляла. Аж бачу, ляцяць самалёты. Бачыла іх упершыню. Самалёты кідалі бомбы. Я залезла на плот, чым вышэй, каб паглядзець, што там робіцца. Мама прыбегла, схапіла мяне на рукі і пабегла хавацца ў жыта. Там ужо было шмат народу. Дзеці плачуць. На іх крычаць: «Не плачце — самалёт пачуе». Іншыя крычаць: «Здымайце белыя хусткі і ляжыце спакойна».

Тату ж Зінаіды Белавушкі вайна застала ў Старадарожскім раёне, дзе ён тады працаваў. Праз некалькі дзён ён і яшчэ двое нейкім чынам дабраліся да роднай вёскі.

— Гэтыя двое засталіся чакаць у жыце (што за яны і адкуль, тата не паспеў расказаць). А бацька пайшоў дадому па правіянт. Ішоў спакойна, не хаваўся, бо не думаў, што ў сваёй вёсцы яго хто-небудзь можа здаць. Неўзабаве наш дом акружылі немцы з аўтаматамі. Іх прывёў наш сусед. Мой тата быў членам партыі. А ў нас на клубе была аб'ява: «Хто ўкажа камуніста, таму дадуць тры тысячы марак, карову, каня з вупражжу і шмат зямлі». Немцы з крыкам: «Матка капут — хаваеш салдат» — пачалі біць маму. Сусед убачыў, што маму заб'юць раней, чым тату, і сказаў немцам, што гэта яе муж. Тады немцы адышлі ад мамы. Далі тату апрануцца і сталі правяраць дакументы. Але ў яго ў кішэні быў толькі прафсаюзны білет. Партыйны і ваенны білет, калі ўваходзілі немцы, ён паспеў кінуць мне за сукенку, якая была падвязана паясочкам. Тату забралі і павялі ў камендатуру. На наступны дзень адвезлі ў Старыя Дарогі, дзе і расстралялі...

Таксама Зінаіда Іванаўна распавяла, як яна дапамагала маці працаваць партызанскай сувязной падчас вайны.

— У нас па той бок дарогі жыў чалавек. Побач з яго домам стаяў дуб, а ў ім — вялікае дупло. У мяне былі доўгія і вельмі густыя валасы. Мама запляце іх у дзве касы, потым складзе кошыкам, туды пакладзе нейкіх паперак, і іх не відаць. Калі мы куды-небудзь сыходзілі, немцы абшуквалі мяне і маму, але на мае валасы ніхто не звяртаў увагі. Праўда, пасля здагадаліся, што інфармацыя «сыходзіць» з вёскі праз той дуб, і спілавалі яго.

### У Белавушкаў не толькі яблыкі, але і гарбузы растуць на дрэвах

Пасля вайны Зіна скончыла 7 класаў, паступіла ў Навапольскую аднагадовую школу. Хацела працягнуць вучобу ў Мінску, але захварэла старэйшая сястра...

— І я вымушана была пайсці працаваць у калгас. Неўзабаве сястра выйшла замуж за прыезджага экскаватаршчыка, пакінула мне хворую маму і з'ехала ў Армавір.

Праца ад цямна да цямна, дома гаспадарка... Але Зіна не страчвала аптымізму. Аддушынай для дзяўчыны была самадзейнасць.

— У нас жа тут клуба не было. Дык мы, трое мужчын і дзяўчаты, паставілі п'есу «Прымакі» Купалы. Без ніякіх кіраўнікоў. І з гэтай сваёй п'есай ездзілі па вёсках. Я і зараз без людзей не магу. Мяне і дагэтуль запрашаюць на розныя канцэрты. Дзе толькі не даводзілася выступаць — нават на «Дажынках» у Бабруйску. Не магу я дома сядзець. Такая ў мяне натура.

— У вас на доме, заўважыла, вісіць шыльдачка «Дом сацыяльных паслуг»?..

— Я многа гадоў абслугоўвала тут людзей. Суседку, вунь, насупраць хата, я даглядзела да самай смерці. Яна ўжо амаль не падымалася, дык я ёй варыла есці і карміла з лыжачкі. А зараз тут у нашай вёсцы ўжо практычна ўсе хаты апусцелі... Ды што гэта мы пра сумнае? Пайшлі, я табе лепш дзіва пакажу. У мяне вунь гарбузы на дрэвах растуць *(смяецца)*.

Гаспадыня не схлусіла. На свае вочы пераканалася, што яе гарбузы, як ліяны, абвівалі высокія яблыні і разам з яблыкамі звісалі з дрэва.

— Зінаіда Іванаўна, у нас дома сёлета таксама нарасло шмат гарбузоў. Можа, падкажыце які рэцэпцік?

— Запамінай. Бяру звечара жоўты пяцікілаграмовы гарбуз, ачышчаю яго ад шалупіння, наразаю кубікамі і заліваю вадой. Назаўтра дадаю туды адзін кілаграм цукру, 30 грамаў лімоннай кіслаты і вару. Пасля пераціраю цераз друшляк і з мякаццю разліваю ў бутэлькі. Гэты смачны і галоўнае карысны для здароўя напітак я раблю штогод.

На развітанне баба Зіна моцна мяне абняла. І сказала: «Прыязджай да мяне ўзімку на тыдзень. За дзён пяць-сем мы тваё ткацкае майстэрства адшліфуем. А я мо са сваім дзедам, калі прыеду ў Мінск, і фотакорам у вас падпрацоўваць стану *(смяецца)*».

**Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.**
*Глускі раён.*

> **Баба Зіна — майстрыха не толькі ткаць. Яна без супынку можа расказваць байкі на роднай мове. Ды так ладна расказвае, што слухаў бы і слухаў. Карыстаючыся магчымасцю, папрасіла збаіць што небудзь смешнае і для чытачоў «Звязды».**
>
> *Кожны дзень, як толькі вечар падступае да варот,*
> *Дзед Пахом, угнуўшы плечы, да экрана прыліпаў.*
> *Сёння ж тупае паблізу, дзьмухае, бы студзіць чай:*
> *«Баба, ну гэты тэлевізар, ты ж хоць сёння не ўключай!*
> *Бо кожны дзень нешта талкуюць, аж слюняк у іх цячэ,*
> *Пра іронію якуюсь ды пра нейкі сэкс яшчэ.*
> *Трэба розум раскірэчыць, каб паняць, каб зразумець,*
> *Бо на мове чалавечай нават не ўмеюць пець.*
> *Можа сэкс — аўтасякера, што патрэбна ў дом якраз?*
> *Там прыдумаюць халеру, там умеюць, там — не ў нас.*
> *А можа, сэкс — то цыгарэты, што з-за мора шлюць паны?*
> *Ну а возьмеш — залатыя, мабыць, ім няма цаны.*
> *Пра цыгарэты я не кемлю — мне махорку лепш падай.*
> *Баба, ну ты пра гэты сэкс лепш ва ўнучкі распытай».*
> *І сягоння, калі зноўку да экрана дзед гарбеў,*
> *Баба грукнула засоўкай і сказала нараспеў:*
> *«Лезь у ложак, пень трухлявы, ды на ногі ўскінь кажух!*
> *Што за дзіва ды забава гэты сэкс, я пакажу.»*
> *А потым коўзь пад коўдру голай...*
> *Дзед у крык: «Вылазь, чума!*
> *Давядзеш да карвалолу, а яго ў мяне няма.»*

Беларусы замежжа

# Падарыла храм землякам

**У мінулую нядзелю ў вёсцы Бычыха Гарадоцкага раёна адбылося вялікае свята. Тут з удзелам Філарэта, Патрыяршага Экзарха Усяе Беларусі, асвяцілі праваслаўны храм, збудаванне якога фінансавала ўраджэнка з гэтай вёскі, бізнэс-лэдзі Настасся Асіціс. Яна таксама з'яўляецца кіраўніком дабрачыннага фонду Роўнаапостальскіх Канстанціна і Алены. Дарэчы, гэта першы ў раёне храм, які поўнасцю пабудаваны з нуля пры дапамозе мецэнатаў.** ***Яго ўнікальнасць у тым, што тут цяпер ёсць частка дрэва Крыжа Гасподняга, якую мецэнаты купілі на аўкцыёне і падарылі вясковаму храму. Як высветлілася, на тэрыторыі былога СССР часткі дрэва ёсць толькі ў храмах на тэрыторыі Крамля. У раёне цяпер усяго дзевяць храмаў. Падарылі храму і іконы з часткай мошчаў свяціцеля Феафана.***

У вёсцы Бычыха, якая мае статус аграрнага гарадка, каля тысячы жыхароў, а на тэрыторыі сельскага Савета — больш як 1,5 тысячы чалавек. У вёсцы ёсць школа, ФАП, клуб. А цяпер — і царква. Цікава, што Бычыха ўваходзіць у так званы «паўночны пояс» Беларусі. І тут зімой рэкордныя тэмпературы марозу. Да з'яўлення храма некаторыя мясцовыя вернікі на службы ездзілі ў суседнія вёскі.

Карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з Настассяй Асіціс.

— Гэта першы ў Беларусі храм, будаўніцтва якога мы поўнасцю фінансавалі. Ён будаваўся амаль два гады інтэрнацыянальнай камандай майстроў — з Беларусі, Украіны, Расіі. Праект храма распрацаваў маскоўскі архітэктар. Храм пабудаваны на месцы, дзе калісьці знаходзіўся дом маёй бабулі. Калі яна памерла, дом прадалі, потым гэтае месца больш за трыццаць гадоў нікому не было патрэбным. А месца вельмі зручнае, дарога побач... Мае бабуля і дзядуля шчыра верылі ў Бога. Наколькі я ведаю, раней тут у вёсцы наогул не было храма. Памятаю, у савецкія гады, каб кулічы асвяціць, трэба было з вёскі ехаць у Расію, — расказвае яна. — Я вырашыла пабудаваць тут храм. У гэтай вёсцы я скончыла школу, потым звязала свой лёс з сувяззю. Я люблю сваю прафесію, лічу, што работа менавіта ў гэтай галіне — маё прызванне. Пасля школы вучылася ў Віцебскім каледжы сувязі, потым — у ленінградскім інстытуце. Жыву зараз у Маскве. Мой бізнэс — гэта ўсё, што звязана з сувяззю: і тэлефоны, і інтэрнэт... Ніколі не страчвала сувязь з Радзімай.



Фота Андрэя ФІЛІМОНАВА.



Спадарыня Асіціс, сказала, што раней і не планавала будаваць храмы і дапамагаць у іх узвядзенні. А гадоў дзесяць таму зразумела: за ўсё тое, што атрымала ад жыцця, трэба нешта зрабіць для людзей, малой Радзімы. Спачатку яны разам з дачкой прынеслі ў дар знакамітаму беларускаму храму Усіх Святых звон, потым у Мінску аказалі дапамогу ў збудаванні храма...

Землякі, безумоўна, вельмі ўдзячныя ёй. Яе аднакласнік Мікалай Паўлаў, які і зараз жыве ў гэтай вёсцы, успомніў у размове з карэспандэнтам «Звязды», што Насця вельмі добра вучылася, была першай прыгажуняй, вельмі выхаванай дзяўчынкай. Школу яны скончылі ў 1966-м годзе.

І цяпер у вёсцы жывуць сваякі Настассі Асіціс, так што яна для вяскоўцаў — заўсёды свая. Побач з храмам дом яе бацькоў.

Дзятве вельмі спадабалася дзіцячая пляцоўка каля храма. Святар, айцец Аляксей, заслужыў аўтарытэт сярод мясцовых жыхароў. Вельмі просяць, каб застаўся ў вёсцы служыць надалей у храме, бо баяцца, што вернецца ў мінскую епархію. Цікава было пачуць ад людзей, што хлопчык, які зараз дапамагае святару, аказваецца, былы хуліган. Святар станоўча паўплываў не толькі на яго.

— Сёння, узносячы свае малітвы да Госпада, мы ўспамінаем жыццё і подзвігі гэтай дзіўнай святой, у гонар якой адбудаваны гэты храм, — адзначыў, звяртаючыся да прыхаджан, **Патрыяршы Экзарх Усяе Беларусі, Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт**. — Яна жыла ў чацвёртым стагоддзі і атрымала славу бязмежным клопатам аб блізкіх сваіх. Яна заўсёды знаходзіла магчымасць дапамагчы тым, каму, на першы погляд, немагчыма было аказаць ніякай дапамогі. Святая Анастасія рызыкуючы сваім жыццём, дапамагала вернікам, тым, хто аказаўся ў няволі. Многіх вязняў выкупляла з цямніц. Таму і празвалі яе Вызваліцельніца вязняў. Святая Анастасія лячыла многіх ад страшных хвароб. І сёння царква прыходзіць у самыя далёкія куткі, даючы людзей святло веры, даруючы сапраўдную духоўную свабоду.

Патрыяршы Экзарх перадаў мецэнатам узнагароды ад імя Патрыярха Маскоўскага і Усяе Русі Кірыла. У гэты дзень вернікі атрымалі ад Патрыяршага Экзарха Філарэта іконы.

Разам з бізнэс-лэдзі ў вёсцы Бычыха пабывалі дзелавыя людзі з розных рэгіёнаў Расіі, а таксама з Малдовы, Украіны, Латвіі. У беларускую глыбінку прыехалі і прадстаўнікі розных узроўняў улады з гэтых краін.

У аблвыканкаме іх азнаёмілі з інвестыцыйнымі праектамі, былі абмеркаваны магчымасці сумеснага ажыццяўлення розных бізнэс-ідэй. Госці падчас наведвання Віцебска дзяліліся сваімі прыемнымі ўражаннямі ад прыгажосці горада, чысціні на вуліцах.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*Вёска Бычыха, Гарадоцкі раён — Віцебск.*

## У Прыпяць на «козліку»

Раніцай 75-гадовы жыхар Жыткавіцкага раёна не справіўся з кіраваннем і на аўтамабілі «ГАЗ-69» заднім ходам з'ехаў у старое рэчышча ракі Прыпяць ля вёскі Пагост. Пенсіянер змог выбрацца з кабіны машыны, але, не даплыўшы да берага, патануў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# УСЕАБДЫМНАЯ ЛЮБОЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Манастырскае падвор'е ў вёсцы Буды Мінскага раёна сустрэла мяне гучным і зусім не дружалюбным брэхам. Але варта было жанчыне ў чорным манаскім адзенні зрабіць усяго толькі жэст рукой, як яе гадаванцы змоўклі і неахвотна папляліся ў свае схованкі. Паслушніца Ірына зайшла ў вальер да белага аўчара па мянушцы Граф. 85-кілаграмовы кабель вышынёю ў 87 сантыметраў падскокваў ад шчасця, радаваўся, віляў сваім хвастом. Бач ты, дастаткова гаспадыні нанесці яму персанальны візіт, дык радуецца, што тое дзіця. І дзе толькі злосць падзелася? Але Графу падабаецца роля абаронцы, і ён працягвае сачыць за маімі рухамі, гатовы ў любы момант кінуцца да мяне, як да крыніцы небяспекі. Зрабіўшы колькі кадраў, ідзём далей, каб залішне не турбаваць жывёлу. Кіруем да вальера з яшчэ большым сабакам. Мяне суправаджае работнік гэтага гадавальніка Аляксандр Мяцельскі. Ён сам надзіва спакойны і гэтак жа спакойна распавядае:

— Рост Бека — 97 сантыметраў, якраз такая і ягоная вага. Як бачыце, сабака перасягнуў нават свайго бацьку Графа. А вось гэтыя сабачкі, — паказвае на суседні вальер, — у нас самыя маленькія, яны з пастуховай пароды «вельшкоргі».





Двух, нібы блізнятак, сабачак, ніколькі не бянтэжыць знаходжанне з суседам-веліканам. Для іх, дарэчы, ужо знайшліся новыя гаспадары, і хутка «кропкі» будуць абжываць сталічныя кватэры. Але яны і тут нядрэнна сябе адчуваюць. Заўсёды падыходзяць людзі, якім проста неабходна лячэбная рэлаксацыя, лашчаць, шкадуюць і частуюць.

— Да нас прывозяць хворых дзетак з Навінак. Вельмі карысна для аднаўлення псіхічнай раўнавагі пасябраваць з жывёламі. Сама ж праца на гэтым падвор'і — гэта яшчэ і форма сацыялізацыі людзей, якія імкнуцца вырвацца з палону наркаманіі ці алкагольнай залежнасці, спрабуюць адаптавацца і адчуць сваю неабходнасць у грамадстве, — тлумачыць сэнс стварэння і ўтрымання манастырскага гадавальніка паслушніца Ірына і дадае: — Чатыры гады таму на базе «Сірына» мы стварылі і гасцініцу, у якую гаспадары на час ад'езду могуць уладкаваць сваіх хатніх любімцаў.

Адзін з тых, хто ўзводзіў гасцініцу, а цяпер яе галоўны захавальнік, якраз мой праважаты Аляксандр Мяцельскі. Па ягоным праекце атрымалася ажно 20 сабачых нумароў. Ёсць тут летняя гасцініца, ёсць дом з абагрэвам, з дыванамі на падлогах. Можна сказаць, гасцініца-люкс. Гаспадары, якія аддаюць сюды сваіх чатырохногіх любімцаў, павінны быць упэўнены, што жывёл тут глядзяць як сваіх уласных. З пяшчотай і ласкай. І ці не таму гасцінічныя нумары пустуюць рэдка? Хоць ад сталіцы да падвор'я адлегласць у добрых трыццаць кіламетраў.

Паслушніца любіць жывёл, а гэтыя боскія стварэнні навыперадкі горнуцца да яе пяшчотных далоняў. Па словах Ірыны, у манастыры ў кожнай сястры-манашкі свой паслух. Нехта гатуе брацтву і сястрыцтву ежу. Нехта дзяжурыць у бальнічных палатах у Навінках, яшчэ хтосьці працуе ў майстэрнях. Яна не сумняваецца, што толькі Богам наканавана ёй быць у гэты час менавіта на гэтым месцы.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**



## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### САВЕТ БЯСПЕКІ ААН ПАЧЫНАЕ РАЗГЛЯДАЦЬ ЗАЯЎКУ ПАЛЕСЦІНЦАЎ

**Учора Савет Бяспекі ААН пачаў працэдуру разгляду заяўкі лідара Палесцінскай аўтаноміі Махмуда Абаса на ўваходжанне ў Арганізацыю Аб'яднаных Нацый.**



Для задавальнення просьбы палесцінцаў патрабуецца падтрымка 9 з 15 членаў Савета, аднак ЗША ўжо заявілі, што накладуць на гэтую заяўку вета. Зрэшты, паводле меркавання дыпламатаў, галасаванне па пытанні членства Палесціны ў ААН можа адбыцца не раней, чым праз некалькі тыдняў.

На мінулым тыдні Абас заклікаў ААН прызнаць Палесцінскую аўтаномію ў якасці паўнавартаснага члена ААН у межах да 1967 года. Але Ізраіль заклікае палесцінцаў вярнуцца да мірных перамоў.

### РАСІЯНЕ КІНУЛІСЯ СКУПЛЯЦЬ ДОЛАРЫ

**Расіяне адрэагавалі на абвастрэнне сітуацыі на фінансавых рынках скупкай валюты. Газета «Коммерсантъ» піша, што за апошнія два тыдні верасня попыт на наяўную валюту вырас на траціну. Паводле слоў банкіраў, апытаных выданнем, найбольш запатрабаванымі аказаліся амерыканскія долары. Акрамя таго, укладчыкі банкаў заняліся канвертаваннем рублёў у валюту на банкаўскіх рахунках.**

У апошнія месяцы з-за абвастрэння пазыковага крызісу ў ЕС і спроб інвестараў пазбегнуць рызык, спалучаных з інвестыцыямі ў эканоміку, якія развіваюцца, пазіцыі расійскай валюты значна аслаблі. Курс долара пачаў расці са жніўня, а ў апошнія тыдні рост толькі паскорыўся. Reuters адзначае, што пры адкрыцці гандлю на біржы ММВБ 26 верасня рубель зменшыўся да долара на 1,2 адсотка да 32,43 рубля — да самага нізкага ўзроўню са жніўня 2009 года.

### БЫВАЙ, КАРЫДА!

**У іспанскім горадзе Барселона ў нядзелю адбылася апошняя ў Каталоніі карыда. Новы сезон карыды налета ў Каталоніі не адкрыецца: рашэннем парламента з 1 студзеня 2012 года бai з быкамі ў гэтым аўтаномным рэгіёне Іспаніі абвешчаны па-за законам.**



«Для такога горада, як Барселона, закрыць гэтую арэну — амаль тое ж самае, што выкінуць холст Пікаса ў смецце», — заявіў на стадыёне Monumental адзін з гледачоў апошняга шоу, 68-гадовы Крыстабаль.

На апошнім боі ў нядзелю быў аншлаг: 18-тысячны натоўп апладзіраваў і суправаджаў усё, што адбывалася, шумнымі крыкамі. У суботу на арэну выйшлі тры самыя вядомыя ў Іспаніі тарэадоры. На арэне ў гэты дзень забілі шэсць быкоў. Апошнім з іх стаў 570-кілаграмовы Дудалегрэ. Пры гэтым тарэадор Хасэ Томас надзеў чорны з золатам «жалобны» гарнітур. Самыя танныя квіткі на карыду, коштам ад 24 да 135 еўра, раскупілі за некалькі хвілін, як толькі ў аўторак адкрыўся продаж. Кошт жа іншых месцаў даходзіў да паўтары тысяч еўра. Звычайна ж у Барселоне карыда не выклікала такога ажыятажу: арэна насілу запаўнялася напалову.

# НЕ АДРЫВАЮЧЫСЯ АД РЭАЛІЙ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Хацеў бы сказаць, што ўсе законапраекты, уключаныя ў сесійны графік, прайшлі альбо яшчэ праходзяць прадугледжаную экспертызу, у тым ліку фінансава-эканамічную, юрыдычную, крыміналагічную, лінгвістычную, а таксама неабходную дапрацоўку.

***— Нават крыміналагічную?***

— У абавязковым парадку. Указам Прэзідэнта яе правядзенне ўскладзена на дзяржаўную ўстанову «Навукова-практычны цэнтр праблем умацавання законнасці і правапарадку Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь». Спецыялісты вызначаюць, ці ёсць у законапраекце нормы, рэалізацыя якіх можа выклікаць узнікненне рызыкі крыміналагічнага характару, і робяць сваё заключэнне. Яно ўлічваецца пры далейшай рабоце над дакументам.

***— Якія яшчэ законапраекты, на ваш погляд, могуць стаць знакавымі для гэтай сесіі?***

— Я выдзеліў бы праект Жыллёвага кодэкса, які ідзе на другое чытанне, а таксама два праекты законаў першага чытання — «Аб дзяржаўнай інавацыйнай палітыцы і інавацыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь» і «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве)». Гэта будуць буйныя, сістэмныя заканадаўчыя рашэнні. Зразумела, пасля праходжання імі ўсёй лесвіцы заканатворчага працэсу і ўступлення ў сілу.

***— Што яшчэ вы лічыце асабліва адметным у сесійнай тэматыцы?***

— Мы мяркуем завяршыць работу над праектамі новых законаў «Аб супрацьдзеянні гандлю людзьмі», «Аб адвакатуры і адвакацкай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь», над шэрагам змяненняў і дапаўненняў у заканадаўства аб барацьбе з карупцыяй і аб прафілактыцы правапарушэнняў непаўналетніх. На стадыі завяршэння і дапрацоўка пакета новых заканадаўчых ініцыятыў па тэматыцы аховы здароўя: аб санітарна-эпідэміялагічным дабрабыце насельніцтва, папярэджанні сацыяльна небяспечных захворванняў, аб аказанні псіхіятрычнай дапамогі і аб дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогіях. Усе яны будуць разглядацца на сесіі ў другім, заключным чытанні. Другое чытанне прадстаіць і тром законапраектам культурнай сферы: папраўкам у законы аб кінематаграфіі і культуры і праекту Закона аб архіўнай справе. Таксама да другога чытання прапануюцца змяненні і дапаўненні ў Кодэкс аб шлюбе і сям'і.

Сярод законапраектаў міжнароднага характару адзначу маючую адбыцца ратыфікацыю міжурадавых пагадненняў з Расійскай Федэрацыяй аб супрацоўніцтве ў галіне даследавання і выкарыстання касмічнай прасторы ў мірных мэтах, у будаўніцтве на тэрыторыі Беларусі атамнай электрастанцыі, аб некаторых мерах па забеспячэнні паралельнай работы энергетычных сістэм нашых дзяржаў, а таксама трох дакументаў па лініі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Назаву таксама ратыфікацыю паправак да Артыкулаў пагаднення Міжнароднага валютнага фонду і Пагаднення з урадам і Нацыянальным банкам Кыргызскай Рэспублікі аб урэгуляванні доўгавых абавязацельстваў і патрабаванняў за 1992 год.

***— Гэта наш доўг?***

— Не, доўг Кыргызстана. У адпаведнасці з Пагадненнем ён будзе вернуты нашай краіне на працягу 2011—2013 гадоў.

***— Якім чынам ён узнік?***

— Гэта розніца па міждзяржаўных разліках.

***— І якая сума доўгу, калі не сакрэт?***

— Сакрэту тут няма. Запазычанасць складае крыху больш за 207 з паловай тысяч долараў ЗША. Яны паступяць у рэспубліканскі бюджэт.

***— Уладзімір Паўлавіч, вы назвалі адным са стрыжнёвых сесійных пытанняў вызначэнне прававой платформы дзяржаўнай інавацыйнай палітыкі і інавацыйнай дзейнасці. Як вы лічыце, ці ёсць у Беларусі адпаведны рэсурс, каб паступальна і вынікова павышаць долю высокатэхналагічнай прадукцыі ў яе агульным аб'ёме і навукаёмістаць валавога ўнутранага прадукту давесці ў недалёкай перспектыве да ўзроўню развітых краін, гэта значыць — павялічыць у 2-3 разы?***

— Такі рэсурс у Беларусі ёсць, гэта нашы працавітыя людзі, іх розум, іх таленты і здольнасці. Прэзідэнт адназначна сказаў, што будучыня нашай краіны за інавацыйным развіццём, за мадэрнізацыяй вытворчасці, павышэннем прадукцыйнасці працы. Наша мэта — інавацыйнае, інвестыцыйнае і высокатэхналагічнае развіццё эканомікі. Адпаведна з ёю кардынальна мяняюцца падыходы да эканомікі прадпрыемстваў. На першае месца пастаўлена рэсурсазберажэнне, зніжэнне сабекошту, якасць тавараў і пашырэнне рынкаў іх збыту, укараненне новых, больш эфектыўных тэхналогій. Зразумела, што прадметам самага сур'ёзнага аналізу і ўвагі павінны быць усе фактары, якія стымулююць або тармозяць інавацыйнае развіццё. Летась былі праведзены парламенцкія слуханні, прысвечаныя стратэгіі інавацыйнага развіцця эканомікі і ролі ў гэтым працэсе навукі і адукацыі. Адбылася зацікаўленая размова па шырокім комплексе пытанняў інавацыйнай сферы з актыўным удзелам кіраўнікоў дзяржаўных органаў і устаноў, прадстаўнікоў суб'ектаў інавацыйнай інфраструктуры і малога інавацыйнага бізнэсу. Цікавыя думкі былі выказаны і па змесце праекта Закона «Аб дзяржаўнай інавацыйнай палітыцы і інавацыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь», які тады яшчэ распрацоўваўся. Хаця рабочы працэс у Палаце прадстаўнікоў па гэтым вельмі важным дакуменце яшчэ працягваецца, думаю, што яго прыняцце дапаможа актыўна культываваць інавацыйныя працэсы ва ўсіх сегментах эканомікі.

Увогуле ж дзявятая сесія будзе даволі працаёмкай і насычанай як па вялікім аб'ёме работы па рэспубліканскім бюджэце і блоку базавых законапраектаў, так і па разнастайнасці заканатворчага зместу сесійнага парадку дня.

***— Ці застанецца ў дэпутатаў час для выезду ў свае выбарчыя акругі, тым больш што ў сесійны перыяд яны будуць удзельнічаць і ў шэрагу міжнародных мерапрыемстваў?***

— Кожны месяц адзін тыдзень мы «бранiруем» для работы ў выбарчых акругах. Выязны тыдзень не здымаецца з парламенцкага раскладу і падчас сесіі. Дэпутаты вядуць пастаянны маніторынг сітуацыі ў сваіх выбарчых акругах, рэгулярна сустракаюцца з людзьмі, трымаюць у цэнтры ўвагі асабліва адчувальныя пытанні і займаюцца іх вырашэннем сумесна з мясцовымі органамі ўлады. Са свайго вопыту магу сказаць, што парламентарыю, каб быць эфектыўным, а значыць — і аўтарытэтным, ніколі не трэба страчваць сувязі са сваімі выбаршчыкамі і з грамадска-палітычнай рэальнасцю. Веданне думкі людзей па шырокім комплексе пытанняў і стане спраў у рэгіёнах дапамагае нам паглыбляць экспертызу законапраектаў і выпрацоўваць найбольш аптымальныя прававыя канструкцыі для вырашэння задач, пастаўленых жыццём. На асенняй сесіі ў гэтым накірунку будуць зроблены чарговыя крокі.

**Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.**

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСОВ

**ГОСУДАРСТВЕННЫЙ КОМИТЕТ ПО ИМУЩЕСТВУ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРИНАДЛЕЖАЩИХ РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ АКЦИЙ ОТКРЫТЫХ АКЦИОНЕРНЫХ ОБЩЕСТВ**

Конкурсы состоятся **9 ноября 2011 г.** по адресу: г. Минск, переулок Краснозвездный, 12.

Организатор конкурсов – Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12.

| № | Полное и сокращенное наименование, место нахождения акционерного общества | Размер уставного фонда, штук акций | Номинальная стоимость акции, рублей | Доля государства в уставном фонде | | Количество продаваемых акций | | Начальная цена продажи акций, рублей | Условия конкурса |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | штук акций | в % к УФ | штук акций | в % к УФ | | |
| 1 | Открытое акционерное общество «Автомобильный парк № 3 г. Могилева» (ОАО «Автомобильный парк № 3 г. Могилева») 212011, г. Могилев, пер. Березовский, 5 | 438 561 | 4 200 | 432 811 | 98,7 | 209 150 | 47,7 | 5 569 350 000 | Предоставить открытому акционерному обществу «Автомобильный парк № 3 г. Могилева» в течение 1 года с даты подписания договора купли-продажи акций заем под 1% годовых: нерезидентом Республики Беларусь – в сумме 381 тыс. долларов США; резидентом Республики Беларусь – в сумме 381 тыс. долларов США либо в сумме, эквивалентной 381 тыс. долларов США по курсу белорусского рубля по отношению к доллару США по итогам дополнительной торговой сессии ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» на дату предоставления указанных денежных средств. |
| 2 | Открытое акционерное общество «Минскгрузавтотранс» (ОАО «Минскгрузавтотранс») 220014, г. Минск, ул. Минина, д. 21, корпус 2 | 745 568 | 150 | 664 332 | 89,1 | 284 956 | 38,2 | 22 797 900 000 | Предоставить открытому акционерному обществу «Минскгрузавтотранс» в течение 1 года с даты подписания договора купли-продажи акций заем под 1% годовых: нерезидентом Республики Беларусь – в сумме 720 тыс. долларов США; резидентом Республики Беларусь – в сумме 720 тыс. долларов США либо в сумме, эквивалентной 720 тыс. долларов США по курсу белорусского рубля по отношению к доллару США по итогам дополнительной торговой сессии ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» на дату предоставления указанных денежных средств. |

Время проведения конкурсов по продаже принадлежащих Республике Беларусь акций:

ОАО «Автомобильный парк № 3 г. Могилева» – 9.30; ОАО «Минскгрузавтотранс» – 10.00.

Для участия в конкурсе по продаже акций соответствующего акционерного общества в срок **до 16.00 24 октября 2011 г.** по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, каб. 409 представляются документы, перечень которых размещен на официальном сайте Государственного комитета по имуществу **www.gki.gov.by** в разделе «Продажа акций» в подразделе «Аукционы-конкурсы». На сайте также размещена дополнительная информация об объявленных конкурсах.

Задатки для участия в конкурсах уплачиваются в размере 10 процентов от начальных цен продажи акций в срок до 4 ноября 2011 г. согласно договорам о задатке, заключаемым с Фондом государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь: в бел. рублях на счет № 3642974000028; в EURO на счет № 3642974005036; в USD на счет № 3642974005052; в рос. рублях на счет № 3642974008046 в филиале № 529 «Белсвязь» ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 720; получатель платежа – Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, УНП 102314789.

Участники конкурсов, выигравшие соответствующий конкурс, обязаны возместить затраты на организацию и проведение конкурсов в течение 3 рабочих дней с даты их проведения.

Договора купли-продажи акций по результатам конкурсов заключаются в течение 20 календарных дней с даты их проведения.

Контактный телефон Фонда государственного имущества: (017) 284 91 13.

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ

**ГОСУДАРСТВЕННЫЙ КОМИТЕТ ПО ИМУЩЕСТВУ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРИНАДЛЕЖАЩИХ РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ АКЦИЙ ОТКРЫТЫХ АКЦИОНЕРНЫХ ОБЩЕСТВ**

Аукционы состоятся **4 ноября 2011 г.** по адресу: г. Минск, переулок Краснозвездный, 12.

Организатор аукционов – Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12.

| № | Полное и сокращенное наименование, место нахождения акционерного общества | Размер уставного фонда, штук акций | Номинальная стоимость акции, рублей | Доля государства в уставном фонде | | Количество продаваемых акций | | Начальная цена продажи акций, рублей | Размер задатка, подлежащего внесению для участия в аукционе | Время проведения аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | штук акций | в % к УФ | штук акций | в % к УФ | | | |
| 1 | Открытое акционерное общество «Белкофе» (ОАО «Белкофе») 231000, Ошмяны, Пушкина, 2 | 173 186 | 300 | 56 496 | 32,6 | 56 496 | 32,6 | 641 666 370 | 64 166 637 | 9.20 |
| 2 | Открытое акционерное общество «Бобруйскэнергомонтаж» (ОАО «Бобруйскэнергомонтаж»), 213827, Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Энергетиков, 9а | 3 459 640 | 105 | 3 106 591 | 89,8 | 3 106 591 | 89,8 | 1 524 363 483 | 152 436 348 | 9.40 |
| 3 | Открытое акционерное общество «Стройкомплект» (ОАО «Стройкомплект») 220012, г. Минск, ул. Чернышевского, 10А | 685 878 | 4400 | 685 538 | 99,95 | 685 538 | 99,95 | 19 674 900 000 | 1 967 490 000 | 10.00 |
| 4 | Открытое акционерное общество «Коралл» (ОАО «Коралл») 246015, г. Гомель, ул. Лепешинского, д. 7 | 7 033 344 | 150 | 7 033 344 | 100,0 | 7 033 344 | 100,0 | 111 040 000 000 | 11 104 000 000 | 10.20 |
| 5 | Открытое акционерное общество «Автомобильная транспортно-экспедиционная компания», г. Витебск (ОАО «АТЭК» г. Витебск) 210035, г. Витебск, ул. Терешковой, 11 | 138 298 | 1000 | 48 606 | 35,1 | 48606 | 35,1 | 8 190 935 000 | 819 093 500 | 10.40 |
| 6 | Открытое акционерное общество «Белэнергоавтоматика» (ОАО «Белэнергоавтоматика») 220021, г. Минск, ул. Омельянюка, 20 | 175 008 | 4400 | 166 991 | 95,4 | 166 991 | 95,4 | 5 552 000 000 | 555 200 000 | 11.00 |
| 7 | Открытое акционерное общество «Специализированная передвижная механизированная колонна № 4», г. Гродно (ОАО «СПМК-4», г. Гродно) 230003, г. Гродно, ул. Карского, 6 | 102 585 | 2400 | 44 669 | 43,5 | 44 669 | 43,5 | 4 792 285 140 | 479 228 514 | 11.20 |
| 8 | Открытое акционерное общество «Столичный проспект» (ОАО «Столичный проспект») 225102, Брестская обл., Жабинковский р-н, г. Жабинка, ул. Титова, дом 3 | 1 322 961 | 140 | 998 552 | 75,5 | 998 552 | 75,5 | 1 214 500 000 | 121 450 000 | 11.40 |
| 9 | Открытое акционерное общество «Лидатрансавто» (ОАО «Лидатрансавто») 231300, Гродненская обл., г. Лида, ул. Качана, 9 | 44 126 | 30000 | 40 503 | 91,8 | 40 503 | 91,8 | 4 713 937 515 | 471 393 752 | 12.00 |
| 10 | Открытое акционерное общество «Экономэнерго» (ОАО «Экономэнерго») 220004, г. Минск, ул. Сухая, 3 | 48 383 | 4400 | 47 275 | 97,7 | 47 275 | 97,7 | 545 876 119 | 54 587 612 | 12.20 |

Для участия в аукционе по продаже акций соответствующего акционерного общества в срок **до 16.00 19 октября 2011 г.** по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, каб. 401 необходимо предоставить документы, полный перечень которых размещен на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by** в разделе «Продажа акций» в подразделе «Аукционы-конкурсы». На сайте также размещена дополнительная информация об объявленных аукционах.

Задаток для участия в аукционе уплачивается в срок до 2 ноября 2011 г. согласно договору о задатке, заключаемому с Фондом государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь: в бел. рублях на счет № 3642974000028; в EURO на счет № 3642974005036; в USD на счет № 3642974005052; в рос. рублях на счет № 3642974008046 в филиале № 529 «Белсвязь» ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 720; получатель платежа – Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, УНП 102314789.

Участники аукционов, выигравшие соответствующий аукцион, обязаны возместить затраты на организацию и проведение аукционов в течение 3 рабочих дней с даты их проведения.

Договора купли-продажи акций по результатам аукционов заключаются в течение 20 календарных дней с даты их проведения.

Контактный телефон Фонда государственного имущества: (017) 284 91 13.

**Раковский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области (продавец)**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:**

**Лот № 1** – земельный участок в агрогородке Раков, переулок Северный, 17 площадью 0, 1328 гектара, кадастровый номер участка 622085715604000027, начальная цена 19 920 000 (девятнадцать миллионов девятьсот двадцать тысяч) белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеется газоснабжение.

**Лот № 2** – земельный участок в деревне Бузуны, участок № 1 Б площадью 0,1500 гектара, кадастровый номер участка 622085702101000248, начальная цена 18 000 000 (восемнадцать миллионов) белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Удаленность от центра агрогородка Раков 4 километра, асфальтированный подъезд, готовится проект уличных сетей (электричество, дорога, водопровод).

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь постоянно проживающим на территории Республики Беларусь или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется квитанцией на расчетный счет госказначейства № 3600614140501 Главное управление МФ РБ по Минской области в ЦБУ № 605, г. Воложин, филиал № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 153001601, УНП 600537220. Код платежа 04901.

Аукцион состоится **28 октября 2011 года (пятница) в 10.00** по адресу: а/г Раков, площадь Свободы, 11, 2-й этаж, зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **до 24 октября 2011 года (включительно) до 17.00** по адресу: а/г Раков, пл. Свободы, 11, кабинет управляющего делами исполкома.

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня подписания протокола.

**Контактные телефоны: (8 01772) 52 2 36; 8029 140 54 37.**

### Цэны на білеты ў сталічных кінатэатрах застануцца на ранейшым узроўні

**Са студзеня гэтага года за прагляд аднасерыйнага фільма мінчане плацяць ад 3500 да 12000 рублёў, двухсерыйнага — ад 4000 да 14000. Дзіцячыя сеансы «каштуюць» 2000 і 2500 рублёў. Кошт квіткоў на стэрэафільмы ў фармаце 3D таксама не выраслі — 15000 і 20000 рублёў.**

Сёлета за студзень—жнівень у мінскіх кінатэатрах пабывалі больш як 3,2 млн гледачоў. Яны набылі білетаў на агульную суму амаль 25 млрд рублёў. Самым папулярным фільмам стаў блокбастар «Піраты Карыбскага мора: На дзіўных берагах». Яго паглядзелі 280 тыс. гледачоў.

**Надзея ТАГАН,**
*«Мінск—Навіны».*

Предложение о покупке акций ОАО «Барановичский молочный комбинат»

Полное наименование и местонахождение Покупателя акций: Закрытое акционерное общество «Белтяжмаш», 220036, г. Минск, пер. Северный, 13, административный корпус (здание № 2), каб. 18, контактный телефон: мтс – 8(029)8504504, велком – 8(044)5898889. Полное наименование и местонахождение эмитента, акции которого покупаются, – Открытое акционерное общество «Барановичский молочный комбинат», г. Барановичи, ул. 50 лет БССР, 51.

Количество акций, которое намеревается приобрести Покупатель, – 13500 (тринадцать тысяч пятьсот) простых (обыкновенных) акций. Цена приобретения акций – 150 000 – 160 000 рублей за одну акцию.

Сроки, форма и порядок оплаты акций: оплата будет производиться денежными средствами в белорусских рублях безналичным перечислением на счет брокера-продавца в день заключения сделки согласно требованиям расчетно-клиринговой системы ОАО «БВФБ». Место совершения сделок – ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа», г. Минск, ул. Сурганова, 48а. Брокер покупателя – ООО «Лидеринвест», г. Минск, ул. Пономаренко, 35а, комн. 241. Дата начала покупки акций – «3» октября 2011 г. Дата окончания покупки акций – «30» января 2012 г.

В случае досрочного приобретения количества акций, указанного в тексте предложения, покупатель имеет право отозвать настоящее предложение тем же способом, которым был объявлен текст предложения о покупке акций.

УНП 100625309

### МАСЛА І ЦЫГАРЭТЫ ЗА МЯЖУ

**Каля в. Пералессе (Кобрынскі раён) супрацоўнікі міліцыі праверылі аўтамабіль «Аўдзі-100».**

Кіроўца — жыхар в. Лукава, што ў Маларыцкім раёне, перавозіў без дакументаў 525 пачак масла «Сялянскае» ды амаль 11 тыс. пачак цыгарэт беларускай вытворчасці. Тавар коштам больш за 35 млн рублёў канфіскавалі.

Застаўся без цыгарэт і беспрацоўны з Брэста, якога затрымалі ў Маларыце пры спробе перавезці 79,5 тыс. пачак цыгарэт. Не пашчасціла і жыхару Гродна. Яго мікрааўтобус спынілі каля в. Клепічы (Пружанскі раён) і падчас дагляду ў ім было знойдзена 60 тыс. пачак цыгарэт.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### ЗАГАРЭЛАСЯ ЗЕРНЕ КУКУРУЗЫ

**20-метровая зернесушылка ў вёсцы Нікалаеўка Буда-Кашалёўскага раёна загарэлася на досвітку.**

Тут знаходзілася 40 тон кукурузы. Прычым асноўную частку атрымалася выратаваць: агнём знішчана толькі 300 кг. У прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС гавораць, што хутчэй за ўсё быў парушаны тэхналагічны рэгламент пры сушцы зерня: адсутнічала яго цыркуляцыя па шахце зернесушылкі. Магчыма, была забіта шахта, якую няякасна прыбралі пасля апошняй сушкі. У выніку ад гарачага паветра адбылося ўзгаранне зерня і шалупіння на сценцы сушыльнай камеры.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### ВІЛЫ, ГРАБЛІ І ПЯЦЬ ЧЫГУНОЎ

**Да 77-гадовай пенсіянеркі з вёскі Шылін Бярозаўскага раёна ў летнюю кухню забраўся злодзей і вынес граблі, вілы, касу, рыдлёўку і нават пяць чыгуноў.**

Неўзабаве знайшлі ахвотніка на чужыя прылады працы ды посуд — ім аказаўся 49-гадовы непрацуючы аднавясковец бабулі.

**Яна СВЕТАВА.**

**г. ВИТЕБСК** **28.10.2011**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ**
**НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА НЕДВИЖИНОСТИ СНИЖЕНА НА 20%**

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 4 | Неиспользуемое здание аптеки № 69 с тремя пристройками, уборной и неиспользуемое здание склада, расположенные по адресу: Витебская область, Верхнедвинский район, Борковский с/с, д. Борковичи, ул. Железнодорожная, 15, и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 251/С-61244 (здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг ) одноэтажное щитовое облицованное кирпичом, фундамент – бутобетонный, перекрытия деревянные, крыша шиферная, с двумя кирпичными пристройками, дощатой пристройкой и крыльцами деревянными, общей площадью 87,3 кв.м, уборной; капитальное строение с инвентарным номером 251/С-62539 (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) одноэтажный деревянный склад, фундамент бутовый, перекрытия деревянные, крыша шиферная, общей площадью 23,3 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 221081201601000003, площадь 0,0481 га для использования под Борковичскую сельскую аптеку № 69, сроком аренды 50 лет. Ограничения (обременения) – охранная зона линии связи, площадь 0,0070 га. Использование – для содержания и обслуживания зданий. | **30469150** | **3046910** |
| 5 | Неиспользуемое здание бывшей аптеки № 126, расположенное по адресу: Витебская область, Дубровенский район, Кленовский сельский совет, дер. Клены, ул. Кленовская, 5, и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение, инв. № 241/С-2389 (здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг) – одноэтажное бревенчатое, 1962 года постройки, фундамент – бетонный, перекрытия – деревянные, крыша шиферная, общая площадь 72,3 кв.м, с верандой. Земельный участок: с кадастровым номером 222482502101000002, площадью 0,0310 га, для содержания и обслуживания здания бывшей аптеки № 126, сроком аренды 50 лет. Ограничения в использовании в связи с расположением земельного участка в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 В и в водоохранной зоне р. Луки площадью 0,0310 га. | **12795207** | **1279520** |

**ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.**

**Аукцион состоится «28» октября 2011 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **последний день приема документов 27.10.2011 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 28.10.2011 с 14.00 до 15.00**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

1. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903027026 в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Банк», БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

**2. Участник,** ставший **победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка, внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

**3. Подробная информация о продавцах, условиях аукциона, условиях участия в аукционе опубликована в газете «Звязда» за 11.06.2011 № 108 (26981) и за 09.07.2011 № 128 (26992).**

**г. ВИТЕБСК** **28.10.2011**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ, РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ**

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи лота, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 6. | Незавершенный строительством объект «Музей-усадьба И. Буйницкого», расположенный по адресу: Витебская область, Глубокский район, Прозорокский с/с, д. Прозороки, ул. Вокзальная, 22 | Характеристика объектов недвижимости: незавершенный строительством объект, общая площадь 505,7 кв.м, фундамент – ж/б блоки, перекрытия – ж/б плиты, стены блочные – облицованные кирпичом, кровля – нет, полы – нет, проемы – нет, внутренняя отделка – нет. Процент готовности – 10 %. Земельный участок: с кадастровым номером 221585411601000187 площадью 0,2567 га для обслуживания объекта «Музей-усадьба И. Буйницкого». | **Одна базовая величина** | **Одна базовая величина** |

**ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон-факс в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: fondvitebsk@tut.by.**

**ПРОДАВЕЦ:** Учреждение «Государственный музей истории театральной и музыкальной культуры Республики Беларусь», контактный телефон в г. Минске: (017) 2270544.

**Условия продажи недвижимости:** создание на территории приобретаемого объекта постоянно действующей экспозиции, посвященной деятельности И. Буйницкого; осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте; создание им дополнительных рабочих мест; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи.

**Аукцион состоится «28» октября 2011 г.** в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

1. Для участия в аукционе приглашаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: негосударственным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Представителем заявителя (кроме случая, когда юридическое лицо представляет его руководитель) предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости (для представителя иностранного юридического лица) легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **последний день приема документов 27.10.2011 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников **28.10.2011 с 14.00 до 15.00**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на **расчетный счет № 3642903027026, в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Банк», БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495**.

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11.03.2010 № 342. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

4. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

5. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

7. Извещения о проведении аукционов были опубликованы ранее в газете «Звязда» от 11.02.2010 № 25 (26633), от 27.03.2010 № 56 (26664).

Парламенцкі дзённік

# АКНО Ў АЗІЮ

*Беларускі парламент атрымаў статус назіральніка ў МПА АСЕАН*

Услед за парламентамі Аўстраліі, ЗША, Індыі, Канады, Кітая, Новай Зеландыі, Папуа — Новай Гвінеі, Расіі, Рэспублікі Карэя, Японіі і Еўрапарламентам. Наўрад ці хто возьмецца аспрэчваць важнасць азіяцкага вектару ў знешняй палітыцы Беларусі. Любыя поспехі на ўсходнім шляху не застаюцца незаўважанымі. А ўмацаванне сувязяў з АСЕАН па парламенцкай лініі стала, лічы, падзеяй топавай важнасці. Сваімі ўражаннямі пасля візіту ў Камбоджу падзяліўся з журналістамі **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Віталь БУСЬКО**. Не пакінуў ён нашага брата і без яшчэ адной важнай навіны — у беларускім парламенце будзе ўтворана рабочая група па супрацоўніцтве з МПА АСЕАН. Яна распрацуе план мерапрыемстваў па ўдзеле ў рабоце Міжпарламенцкай асамблеі. Падобнае ўзаемадзеянне дазволіць не толькі весці палітычны дыялог па ключавых тэмах міжнароднага парадку дня, але і прасоўваць нацыянальныя інтарэсы ў Паўднёва-Усходняй Азіі. А гэта ні многа ні мала — Бруней, В'етнам, Інданэзія, Камбоджа, Лаос, Малайзія, М'янма, Сінгапур, Тайланд і Філіпіны.

«Статус назіральніка ў МПА АСЕАН адкрывае Беларусі пляцоўку для пастаяннага дыялогу з краінамі-ўдзельніцамі па эканамічных, палітычных, сацыяльных і гуманітарных пытаннях», — удакладняе В. Бусько. У якасці прыкладу найбольш перспектыўных сфер супрацоўніцтва ён называе сельскую гаспадарку. Паводле яго інфармацыі, 80 адсоткаў насельніцтва згаданага азіяцкага рэгіёна занята якраз у аграрным сектары, прычым выкарыстоўваецца там пераважна ручная праца. Тамтэйшы рынак, адпаведна, адкрывае вялікія магчымасці для нашых вытворцаў сельгастэхнікі, а таксама экспарту паслуг у сферы сельскагаспадарчай адукацыі, робіць выснову дэпутат. Ён распавёў і пра дасягнутыя дамоўленасці аб супрацоўніцтве ў галіне медыцыны. Плануецца, у прыватнасці, што айчынныя спецыялісты пройдуць стажыроўку ў Камбоджы, дзе практыкуюцца нетрадыцыйныя метады лячэння. Беларусь таксама зацікаўлена ў пастаўках каўчуку, які выпрабляюць літаральна ўсе краіны рэгіёна. І гэта толькі тое, што прыходзіць наўскідку. Натуральна, пры больш шчыльным узаемадзеянні перспектыў з'явіцца значна больш. Бо АСЕАН (у перакладзе з англійскай абрэвіятуры — Асацыяцыя краін Паўднёва-Усходняй Азіі) — гэта 600 млн насельніцтва, амаль 2 трлн долараў сукупнага ВУП і стабільны эканамічны рост. Чым не поле для дзейнасці?

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

## ВУЧЫМ ЗАМЕЖНЫЯ МОВЫ, АЛЕ НЕ ЗАБЫВАЕМСЯ НА СВАЮ

**Ужо дзесяць гадоў мінула, як пачаў адзначацца Еўрапейскі дзень моў. З'яўленне свята звязана з тым, што новае тысячагоддзе ЮНЕСКА абвясціла часам паліглотаў, бо валоданне замежнымі мовамі спрыяе павышэнню ўзроўню міжкультурнага ўзаемаразумення. Уласна і пачыналася тысячагоддзе менавіта годам моў. Падчас гэтага свята ўзгадваецца не толькі пра неабходнасць валодання замежнымі мовамі, але і пра захаванне шматмоўя.**

Штогод 26 верасня ў розных краінах свету праходзяць адпаведныя мерапрыемствы, звязаныя з гэтым днём: гэта могуць быць як навуковыя канферэнцыі, так і фестывалі, падчас якіх адначасова можна пачуць словы з розных моў, і знаёмствы з казкамі народаў свету. Але сэнс гэтага свята не проста ў тым, каб узгадаць, што існуе шмат розных моў, а і заахвоціць да іх вывучэння. Прычым, заахвочваецца інтарэс да вывучэння нават не адной замежнай мовы. У час, калі ў свеце дамінуючай пачала станавіцца англійская, такія захады садзейнічаюць таму, што ствараюцца больш спрыяльныя ўмовы для развіцця розных моў.

Між іншым, у многіх еўрапейскіх краінах прынята, што дзеці адначасова вывучаюць 2-3 замежныя мовы і да заканчэння школы дасканала валодаюць імі. Дарэчы, у гэты час узгадваецца, што авалодваць замежнымі мовамі патрэбна не толькі ў школах. Вывучаць іх можна на працягу ўсяго жыцця.

Трэба заўважыць, што захаванне і развіццё моў, у тым ліку і малых, дэкларуецца ў афіцыяльнай моўнай палітыцы Еўрасаюза. Кожны год знікае некалькі моў. А знікненне мовы можна прыраўноўваць да знікнення часткі культуры пэўнага народа. І Еўрапейскі дзень моў у тым ліку прыцягвае ўвагу да гэтай праблемы, выхоўвае павагу да розных моў.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## У Беларусі рэгіструецца больш і шлюбаў, і разводаў

**У Беларусі прадаўжае павялічвацца і колькасць шлюбаў, і колькасць разводаў, паведаміла ў Нацыянальным статыстычным камітэце Алена Кандраценка.**

Так, за студзень—жнівень гэтага года ў рэспубліцы зарэгістравана 53,5 тыс. шлюбаў. Колькасць новых сямейных саюзаў павялічылася ў параўнанні са студзенем—жніўнем 2010 года на 7,6 працэнта. Дарэчы, станоўчая тэндэнцыя росту колькасці шлюбаў намецілася ў студзені—маі 2011 года (на 1,9 працэнта да ўзроўню студзеня—мая 2010-га), у наступныя месяцы яна ўмацавалася. За восем месяцаў гэтага года на 1000 жыхароў рэспублікі шлюбаў было 8,5 (за аналагічны мінулагодні перыяд — 7,9).

Паводле аператыўных статыстычных даных, у студзені—жніўні гэтага года скасавана звыш 24,6 тыс. шлюбаў. Колькасць разводаў прадаўжае павялічвацца — іх стала на 8 працэнтаў больш у параўнанні са студзенем—жніўнем 2010 года. Паказчык разводаў павысіўся адпаведна з 3,6 на 1000 жыхароў да 3,9. Пры гэтым у студзені—жніўні мінулага года на 1000 зарэгістраваных шлюбаў прыпадала 459 разводаў, а ў студзені—жніўні гэтага года — 460.

## ЧАЦВЯРЫХ АГОНЬ НЕ ПАШКАДАВАЎ

Пры пажары ў вёсцы Галубіца на Петрыкаўшчыне спрацаваў апавяшчальнік. У той жа час 9-гадовы хлопчык, які пачуў сігнал і адчуў пах дыму, разбіў акно і ўцёк да свайго дзядзькі. У доме засталіся яго бацька, маці, дзве маленькія сястры і пляменніца. Яе праз акно паспелі выратаваць старшыня сельскага выканкама разам з суседам. Пасля гэтага ў памяшканні адбыўся выбух газавага балона. Калі выратавальнікі прыбылі на месца здарэння, дах драўлянага дома быў ахоплены полымем. Агонь забраў жыцці непрацуючага 40-гадовага гаспадара, яго 37-гадовай жонкі і дзвюх дачок. Адной было 5 гадоў, другой — 2 месяцы. У жывых засталася 16-гадовая маці трохмесячнай выратаванай дзяўчынкі. Маладая матуля-адзіночка ў гэты начны час гуляла на вуліцы. У прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС прычынай пажару папярэдне лічаць неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні гаспадара дома. Са слоў старшыні Галубіцкага сельвыканкама Уладзіміра Аляксандрава, ён толькі вярнуўся пасля лячэння ад алкагольнай залежнасці. Разам з тым, напярэдадні пажару суседзі бачылі мужчыну і яго жонку ў нецвярозым стане.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**1. Покупатель:** Смольская Наталья Сергеевна, почтовый адрес: 220022, г. Минск, ул. Чайлытко, 15—99, тел. vel 667 46 43.

**2. Брокер:** Общество с ограниченной ответственностью «Брокерская компания «Аналитик», расположенная по адресу: 220040, г. Минск, ул. М. Богдановича, 153, офис 612, тел./факс 286 02 09.

**3. Эмитент:** Открытое акционерное общество «Постторг», юридический и почтовый адрес: 220070, г. Минск, ул. Клумова, 3.

**4. Общее количество покупаемых акций:** 2500 (две тысячи пятьсот) простых (обыкновенных) акций.

**5. Цена покупки одной простой (обыкновенной) акции:** 30 000 (тридцать тысяч) белорусских рублей.

**6. Оплата акций** производится в день заключения сделки безналичным расчетом через расчетно-клиринговую систему ОАО «БВФБ» в соответствии с правилами заключения сделок на ОАО «БВФБ».

**7. Сделки купли-продажи акций заключаются** на биржевом рынке. Адрес, по которому будут заключаться сделки купли-продажи: ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» 213013, г. Минск, ул. Сурганова, 48а.

**8. Дата начала покупки акций** — 4 октября 2011 года. Дата окончания покупки акций — 31 декабря 2011 года.

## Два «зэкі» збеглі з мазырскай калоніі



**Адзін з іх затрыманы раніцай ля вёскі Міцькі Мазырскага раёна. Другога, жыхара Жлобіна (які адбываў пакаранне за разбой), міліцыя шукае.**

Як паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, грамадзяне знаходзіліся ў прамысловай зоне выпраўленчай установы. Для рэалізацыі свайго плана выкарысталі самаробнае драўлянае прыстасаванне і лесвіцу: збеглі, пераадолеўшы агароджу. Пошукі 33-гадовага Дзмітрыя Абразцова *(на фота)* працягваюцца.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Погляд

# УСЁ МАЕ СВАЮ МЯЖУ

**Ёсць няпісаныя законы, якія дзейнічаюць незалежна ад нашага жадання. І найлепш гэта можна заўважыць у сферы эканомікі.**

Тыдзень таму наведаў кірмаш «Палескі» ў Баранавічах і купіў 2 кілаграмы мяса па цане 37 тысяч рублёў — самае лепшае, што ляжала на прылаўку. Пакупнікі былі, але і мяса хапала. Праз нейкі дзень кошт мяса падымаецца на 20%, бо, як мы ведаем, працэс выраўноўвання цэн працягваецца.

У мінулыя выхадныя я зноў наведаў «Палескі» і ўбачыў, што цана на мяса не ўзляцела — варухнулася толькі на пару тысяч. Не ведаю, як у іншых гарадах, а ў Баранавічы па мяса прыязджаюць нават з Мінска.

А з рачной (сажалкавай) рыбай увогуле атрымаўся канфуз. Месяц таму за буйнога карпа рыбгасы прасілі па 20 тысяч за кілаграм. Але пакупнік да карпа не праявіў цікавасці. А сёння да цыстэрнаў з рыбай выцягваюцца не чэргі, а калоны. Бо цана на карпа ўпала да 12 — 13 тысяч. А дробнага карася можна купіць і за 5 тысяч. Менавіта па такой цане прадаваў сваю прадукцыю рыбгас «Лактышы».

Летась восенню кошт бульбы хістаўся ў межах 1500—2000 рублёў за кілаграм. І вось, улічыўшы гэты фактар, многія вытворцы сёлета выкінулі на рынак столькі бульбы, што прапанова ўжо перавышае попыт. Можна набыць бульбу па 1000 рублёў за кілаграм з дастаўкай. Кошт капусты яшчэ ніжэй — 700 рублёў за кілаграм. Летам за кілаграм мёду прасілі 50—60 тысяч, а цяпер гэты салодкі прадукт і за 35 тысяч можна купіць.

Але гэтая прадукцыя дробнага прыватніка, фермераў ці мясцовых сельгаскааператываў. Яны бульбу, моркву ды капусту ў Маскву прадаваць не павязуць. А вось калі б з Расіі прыйшлі фуры па гародніну, то з вялікім задавальненнем збылі б усё расіянам і пра свайго пакупніка не падумалі б. Прыбытак кіруе рынкам, на ім усё і трымаецца. Устанавіць фіксаваную цану можна, але гэта ўжо будуць не рынкавыя адносіны. У кожнага рынку (унутранага) свае магчымасці, і яны вызначаюцца, не ў апошнюю чаргу, пакупной здольнасцю насельніцтва.

Беларускі рынак у гэтым плане істотна адрозніваецца ад расійскага, і таму, лічу, выраўноўванне цэн прывядзе да негатыўных наступстваў...

*«Некаторыя, у тым ліку і я, прытрымліваюцца думкі, што поўнага выраўноўвання цэн з Расіяй не павінна быць. Мы павінны працаваць у іншай нішы, нашы тавары, асабліва сельскагаспадарчыя, павінны каштаваць ніжэй, чым у Расіі»,* — заявіў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Сяргей РУМАС.

Мы не займаліся фарміраваннем свайго рынку. І нашы прадпрымальнікі, як і звычайныя пакупнікі, па тавар ездзяць на аптовыя рынкі Масквы ці Хмяльніцкага ва Украіну. А чаму такі рынак не быў створаны ў Беларусі? Няхай бы валюту везлі да нас!

Дзяржава не можа быць безуважнай да рынку, павінна не перашкаджаць яму, а стымуляваць яго дзейнасць. Калі ў старажытным Рыме пачаў адчувацца недахоп мяса, то імператар адмяніў на яго падаткі і Рым «завалілі» мясам.

На рынак уплывае і стан нацыянальнай валюты. А яна ў нас яшчэ не стабілізавалася. І тут таксама няяснасць.

Апошнім часам толькі і чуецца, што долар адносна беларускага рубля падае. А каля абменнікаў валюты зацішша. Долар, які падае, насельніцтва купляць не спяшаецца. Дзе мяжа, на якой долар спыніцца? І справа не толькі ў таргах, якія быццам бы вызначаюць суадносіны валют, але і ў наяўнасці тых жа долараў у запасніках Нацыянальнага банка.

### «Загартаваныя ў бітвах»?

Назіраючы за пенсіянерамі, якія прыйшлі на пошту атрымліваць свае 500 тысяч, можна было падумаць, што іх «жыццё ўдалося». Вясёлыя, мітусяцца, і ніякіх нараканняў на цэны...

Наш чалавек загартаваны. Жыццё пенсіянераў прайшло за савецкім часам у барацьбе з імперыялізмам і расізмам, савецкі народ змагаўся за мір і свабоду Анжэлы Дэвіс (хто яе памятае), перамагаў у пяцігодках. А бітвы за ўраджай? І калі народ жыве ад бітвы да бітвы, то цэнамі яго ўжо не напалохаеш.

Многія жылі і працягваюць жыць у становішчы жорсткай эканоміі. І тут можна эканоміць не толькі на прадуктах. Чалавек памыўся, а ваду не злівае, бо можна выкарыстаць яе і для іншых мэт. Яшчэ ёсць запасы цукру, алею, круп...

Працавітасць і ашчаднасць (якую можна назваць і скупасцю) дасталіся беларусам ад продкаў, якім на працягу стагоддзяў не толькі цяжка жылося, але і прыходзілася змагацца за права жыць.

Дык чаму ж на гэтыя якасці народа сёння не робіцца стаўка?

Адзін з нашых тэлеканалаў неяк паведаў, што ў суседняй краіне няма ніводнай беларускай школы... Усё гэта правільна. Але разам з тым чамусьці не гаворым, а колькі беларускіх школ у нашых гарадах? Напрыклад, у Баранавічах няма ніводнай...

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**
**Фота аўтара.**



За карпам.

Прамая лінія

# Каб пазбавіцца ад храпу, часта дастаткова мінімальнай аперацыі



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

**НАШ голас — гэта тое, з чым мы нараджаемся і што адрознівае нас ад сабе падобных. Як захаваць яго маладым і прыгожым? Што нельга рабіць і якія прадукты ўжываць, каб не псаваць голас і не страціць яго? Як не ператварыць звычайны насмарк у хранічны і што рабіць, калі пастаянна баліць горла? Якія прычыны храпу і як ад яго пазбавіцца? Якія прыстасаванні для гэтага найбольш падыходзяць і ці трэба рабіць аперацыю? Чаму сёння не рэкамендуецца выдаляць адэноіды ў большасці дзяцей і як своечасова пазбегнуць раку гартані? Гэтыя і іншыя праблемы мы разам з нашымі чытачамі абмеркавалі на «прамой лініі» «Звязды» з урачом-фаніятрам РНПЦ отарыналарынгалогіі Вольгай Радзівонавай.**

***☎— Наталля Іванаўна, Мінск. Мне 45 гадоў. Я доўгі час курыла, але ўжо 2 гады як кінула. Аднак голас усё роўна хрыплы. Ці можна гэта неяк паправіць?***

— Справа ў тым, што ў чалавека, які доўга курыць, асабліва ў жанчын, галасавыя складкі падвяргаюцца змяненню, часам незваротнаму. Можа адбыцца паліпознае перараджэнне слізістай, і ў некаторых выпадках неабходна гэтыя паліпы выдаляць. Тады ёсць надзея, што новая слізістая, якая заменіць старую, хворую, будзе больш здаровай і голас стане лепшым. Аднак дабіцца зусім чыстага голасу ўжо не атрымаецца.

Вам трэба звярнуцца да ЛОР-урача па месцы жыхарства. Доктар можа вырашыць, ці ёсць неабходнасць у аперацыі, або накіруе на кансультацыю да фаніятра ў наш цэнтр.

***☎— Алена, Навагрудак. У мяне кожную восень баліць горла. Хаця ніякіх іншых сімптомаў прастуды няма — ні тэмпературы, ні насмарку. З чым гэта можа быць звязана?***

— Не выключана, што ў вас хранічны фарынгіт, які пачынае сябе праяўляць пры пахаладанні і пры змяненні вільготнага тэмпературнага рэжыму на вуліцы.

Аднак болі ў горле могуць быць звязаны і з іншымі захворваннямі. Напрыклад, такімі, як хранічны гастрыт, калі ёсць гастраэзафагальная рэфлюксная хвароба. Боль у горле можа з'яўляцца пры дэгенератыўных працэсах у шыйных аддзелах пазваночніка, калі ёсць глыбокія мышачныя болі. Вам неабходна абследавацца ў спецыялістаў.

***☎— Соф'я Міхайлаўна, Валожын. У нашага сына пераходны ўзрост. У яго мяняецца голас. Ці трэба праводзіць нейкія спецыяльныя мерапрыемствы, каб гэты працэс прайшоў больш паспяхова?***

— Праз мутацыю голасу, ці, як яшчэ гавораць у народзе, «ломку», праходзяць усе падлеткі. І лічыць гэты стан хваробай не трэба. Калі голас мяняецца паступова, роўна, у адпаведнасці з узростам, то ніякіх спецыяльных мерапрыемстваў праводзіць не варта.

Калі хлопчык займаецца спевамі, то некаторыя абмежаванні і кантроль з боку спецыяліста, педагога неабходныя.

У гэтым узросце нельга асабліва гучна крычаць. Харчаванне павінна быць дастаткова рацыянальным. Варта пазбягаць прыёму газаваных напояў, вострай, халоднай ежы, каб не правакаваць раздражненне слізістай і ўзнікненне частых прастудных захворванняў. І тады мутацыя пройдзе гладка.

Але часам мутацыя голасу затрымліваецца ў падлеткаў з рухомай псіхікай. Некаторым з іх нават патрабуецца кансультацыя псіхолага, дапамога псіхатэрапеўта. Аднак гэта вельмі рэдкія выпадкі.

***☎— Галіна Фёдараўна, Мінск. Майму мужу 57 гадоў, ён вельмі моцна храпе ў сне, нават суседзі скардзяцца. Ці можна яму неяк дапамагчы?***

— Можна. Але ў якой ступені дапамагчы, гэта трэба вызначыць пры аглядзе. У нашым цэнтры пачалі займацца праблемамі храпу, яго хірургічным лячэннем. Вам неабходна трапіць на кансультацыю да тых спецыялістаў, якія займаюцца гэтай праблемай. Таму патэлефануйце ў рэгістратуру (тэл. 200 85 24 і 200 84 50) і абавязкова скажыце, што вы хочаце пракансультавацца з прычыны храпу.

***☎— Ніна Рыгораўна, Вілейка. Мая сваячка дрэнна вымаўляе некалькі літар. Скажыце, ці можна пазбавіцца ад дрэннага вымаўлення ў дарослым узросце?***

— Думаю, дапамагчы ёй крыху можна. Але трэба высветліць, з чым звязана гэта дрэннае вымаўленне. Неабходна пракансультавацца ў лагапеда па месцы жыхарства, а таксама ў неўролага. З дарослымі лагапеды таксама працуюць.

***☎— Іна Пятроўна, Лепель. У мяне пастаянна баліць горла. Дактары ставяць дыягназ «ларынгіт і фарынгіт». Прымала шмат лекаў, але лепш не становіцца. Скажыце, з чым гэта можа быць звязана? Ці можна абследавацца ў вашым цэнтры? Што для гэтага патрэбна?***

— Гэта можа быць звязана са шматлікімі прычынамі. Напрыклад, са станам зусім іншых органаў і сістэм, з пабочным дзеяннем нейкіх прэпаратаў, якія пацыент пастаянна прымае, са станам поласці рота, зубоў, зубных пратэзаў.

Каб атрымаць кансультацыю ў нас, неабходна ўзяць накіраванне ад ЛОР-урача па месцы жыхарства, пазваніць у рэгістратуру (тэл. 200 85 24 і 200 84 50) і запісацца. Калі вы не атрымаеце накіравання, то можна звярнуцца платна. Тэлефон платнай рэгістратуры: 226 49 52.

***☎— Барыс Пятровіч, Гомель. Чуў, што ёсць нейкія прыстасаванні для таго, каб менш храпці ў сне? Што гэта за прыстасаванні?***

— Існуе шмат розных прыстасаванняў, як і іх мадыфікацый. А гэта гаворыць аб тым, што ні адно з іх не з'яўляецца ідэальным вырашэннем праблемы.

Перш, чым прымяняць тое або іншае прыстасаванне, неабходна пракансультавацца як мінімум у ЛОР-урача. Часам для таго, каб менш храпці, дастаткова зрабіць мінімальную аперацыю ў носе ці на мяккім паднябенні, і тады не спатрэбіцца ніякіх прыстасаванняў. Бывае, што чалавек храпе ад таго, што ў яго ёсць хранічныя захворванні сардэчна-сасудзістай, нервовай сістэм.

У любым выпадку неабходна правесці глыбокае абследаванне, у тым ліку і з прыцягненнем неўрапатолага, кардыёлага. Пачніце абследаванне з кансультацыі отарыналарынголага.

***☎— Валянціна Іванаўна, Барысаў. Дзіцяці 10 гадоў. У яго часта здараюцца ангіны. Ці можа гэта нашкодзіць голасу? Аднойчы было такое, што голас прапаў...***

— Безумоўна, хранічныя ачагі інфекцыі ў носе, насаглотцы, глотцы ўплываюць на стан галасавых складак, гартані, трахеі. Калі дзіця займаецца спевамі і збіраецца далей прысвяціць гэтаму сваё жыццё, ды і ўсім астатнім, то, безумоўна, хранічныя ачагі інфекцый трэба своечасова саніраваць, назірацца і лячыцца ў ЛОР-урача.

***☎— Пётр Пятровіч, Навагрудак. Вось ужо месяц не магу пазбавіцца ад насмарку, нос пастаянна закладзены, не магу спаць. Таму закапваю нос па 3—4 разы за ноч. Што гэта можа быць? І як ад гэтага пазбавіцца?***

— Перш за ўсё неабходна выключыць паталогію прыдаткавых пазух носа. Зрабіць здымак, паглядзець, ці няма нейкага зацягнутага, прапушчанага, нялечанага сінусіту. Таксама трэба выключыць паліпозны працэс і алергію на пылок раслін. Усё залежыць ад таго, як гэта пачалося і як працякае.

А ўвогуле з узростам можа развівацца т.зв. круглагадовы хранічны насмарк, якому садзейнічае частае і працяглае ўжыванне сасудазвужальных кропляў. Таму самастойна лячыцца не трэба, а варта звярнуцца да отарыналарынголага па месцы жыхарства.

***☎— Уладзімір Сяргеевіч, Смалявічы. У мяне раптоўна прападае голас. З чым гэта можа быць звязана і што мне рабіць?***

— Голас можа прападаць раптоўна па многіх прычынах. Пачынаючы ад нейкіх хранічных запаленчых захворванняў галасавых складак, у людзей, якія кураць, працуюць у шкодных умовах, маюць справу з павышанай галасавой нагрузкай, і заканчваючы функцыянальнымі парушэннямі голасу на фоне нервова-псіхалагічных эмацыянальных перагрузак. Неабходна ў той момант, калі адчуеце сябе горш, паказацца ЛОР-урачу ці фаніятру. І спецыяліст будзе прымаць рашэнне, што рабіць у такім выпадку.

***☎— Таццяна Мікалаеўна, Магілёў. Чым абумоўлены рак гартані? І наколькі эфектыўна ён зараз лечыцца?***

— Найбольш частай прычынай раку гартані з'яўляецца курэнне, на другім месцы стаяць т. зв. перадракавыя станы, якія ўзнікаюць на фоне хранічных запаленчых працэсаў гартані, г.зн. перараджэння розных папілом, паліпаў.

Што датычыцца эфектыўнасці лячэння. Усё залежыць ад таго, на якой стадыі пацыент трапіў да спецыялістаў. Чым раней гэта будзе зроблена, тым лепш. Людзям, якія маюць гэтыя правакуючыя фактары, неабходна 1—2 разы ў год паказвацца отарыналарынголагу.

Справа ў тым, што гартань — даступны агляду орган. І калі чалавек трапляе да ўрачоў з запушчанай формай раку гартані, гэта вельмі крыўдна, бо ў большасці выпадкаў паталогію можна было дыягнаставаць пры звычайным ЛОР-аглядзе і своечасова прыняць меры.

Нават калі ў працэсе лячэння даводзіцца цалкам выдаляць гартань, людзі могуць навучыцца размаўляць з дапамогай т.зв. псеўдаголасу (ці страваводнага голасу, чрэвавяшчання). Ёсць прыклады, калі людзі вярнуліся ў актыўнае жыццё, працуюць і нават размаўляюць па мабільным тэлефоне. Але да такога лепш не даводзіць, бо на першых стадыях рак гартані лечыцца з захаваннем органа, і нават не хірургічным шляхам, а паддаецца прамянёвай тэрапіі.

***☎— Зінаіда Васільеўна, Стоўбцы. У мяне праблемы з голасам і дыханнем, ёсць скрыўленне насавой перагародкі. Голас знікае, дыхаю толькі левай ноздрай. Дзе мне можна пракансультавацца?***

— Можна пракансультавацца ў нас у цэнтры. Трэба ўзяць накіраванне ў ЛОР-урача па месцы жыхарства, патэлефанаваць у рэгістратуру (тэл. 200 85 24 і 200 84 50) і запісацца.

***— А без накіравання нельга?***

— Калі вы не атрымаеце накіраванне, то можна звярнуцца платна. Тэлефон платнай рэгістратуры 226 49 52.

***☎— Вера Леанідаўна, Мінск. Якія могуць быць прычыны храпу?***

— Іх шмат. Гэта можа быць нейкая механічная перашкода, якая ўскладняе праходжанне паветра праз нос, насаглотку з-за таго, што ёсць скрыўленні насавой перагародкі, насавыя хранічныя захворванні: рыніты, паліпы, павялічаныя міндаліны, у дзяцей — адэноіды. Ёсць і ўзроставыя прычыны.

***— А ці можна пазбавіцца ад храпу?***

— Перш за ўсё трэба вызначыць яго прычыну і абследавацца. У нашым цэнтры вам могуць у нейкай ступені дапамагчы. Трэба тэлефанаваць у рэгістратуру і гаварыць рэгістратару, што вы хочаце пракансультавацца з прычыны храпу. У нас створана навуковае накіраванне па распрацоўцы праблемы храпу.

***☎— Жанна, Мінск. Мне 38 гадоў. Я спяваю ў тэатры, а нядаўна голас «сеў». Ці можна яго хутка аднавіць?***

— Калі вы адчуваеце нейкі дыскамфорт перад спевамі, то спяваць у такой сітуацыі непажадана. Гэта можа быць сімптомамі нейкай хваробы, якая пачынаецца. Таму вам трэба пракансультавацца ў фаніятра.

**«Прамую лінію» падрыхтавалі Алена АЎЧЫННІКАВА і Вольга ШАЎКО.**

***(Працяг будзе.)***

# ВАЖКІЯ КАВУНЫ




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*г. Мінск.*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 7 октября 2011 года в 11.00 по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12, конференц-зал.**

Организатор аукциона – РУП «Белтелеком» в лице Могилевского филиала РУП «Белтелеком», находящегося по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12.

На аукционах выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

**1. Отдельные помещения на 2 этаже в капитальном строении (здание специализированное связи), общей площадью 70,2 кв.м (10,4; 6,8; 35,5; 17,5) по бульвару Юбилейному в г. Могилеве.** Срок договора аренды – на неопределенный срок, но не менее 3-х лет; коэффициент по пункту 9.2. Указа Президента Республики Беларусь от 23.10.2009 года № 518 «О некоторых мерах аренды и безвозмездного пользования имуществом» 2,5.

Помещения будут выставлены на аукцион по продаже права заключения договоров аренды одним лотом. Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 614 250 рублей, размер задатка – 61 430 рублей.

Документы на участие в аукционе принимаются **с 27.09.2011 года по 06.10.2011** в рабочее время (с 8.00 до 17.00) по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12, каб. 401. Документы, поданные после 06.10.2011 года, не рассматриваются.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе перечисляет задаток на с/с 3012200007522 в филиале № 700 Могилевского областного управления АСБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700838273, Могилевский филиал РУП «Белтелеком».

Извещение о проведении первого аукциона было опубликовано в газете «Звязда» за 09.09.2011 № 172.

**Контактные телефоны: (8 0222) 29 21 33, 29 22 13, факс 22 54 58.**

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2011 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 3 кастрычніка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць прас, чайнік, параварку або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **5 кастрычніка 2011 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 15 кастрычніка 2011 г.**

Дастаўку параварак і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 31 снежня 2011 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2011 года і пашпарта. **Пасля 31 снежня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 30.08.11 г.

**Тэрмін правядзення гульні — з 30.08.11 па 31.12.11.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1915 ад 18.08.11, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

## 5 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2011 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку ______________________

______________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ______________________
(аддзяленне сувязі)

______________________ на IV кв. або 2–е паўг. 2011 года

Хатні адрас і тэлефон [          ] ______________________
(індэкс)

______________________

______________________

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ на газету** [          ] (індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Колькасць камплектаў [  ]

на 2011 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму ______________________
(прозвішча, ініцыялы)

Куды ______________________
(адрас)

______ (паштовы індэкс) ______ (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету** [          ] (індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

| Кошт | падпіскі | ________ руб. | Колькасць камплектаў | |
|---|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ________ руб. | | |

на 2011 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму ______________________
(прозвішча, ініцыялы)

Куды ______________________
(адрас)

______ (паштовы індэкс) ______ (горад, населены пункт)

# ХУТЧЭЙ, МАЦНЕЙ!

**Спартыўна-аздараўленчае свята з удзелам супрацоўнікаў структурных падраздзяленняў Камітэта дзяржаўнай бяспекі і членаў іх сем'яў адбылося ў мінулыя выхадныя на базе санаторыя «Лясное».**

У спаборніцтвах па стральбе, перацягванні каната, настольным тэнісе, сілавых відах спорту было разыграна 11 камплектаў узнагарод. Першае месца ў сілавых практыкавання[ заняла каманда Інстытута нацыянальнай бяспекі, перацягванні каната — прадстаўнікі 14-га асобнага палка ўрадавай сувязі, сямейнай эстафеце — каманда ўпраўлення КДБ па Мінску і Мінскай вобласці.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**



Фота Артура СТРЭХА.

Далёкае — блізкае

# «Знаходжанне маё тут, у Гродне, было падобна на прыгожы сон...»



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

**У горадзе над Нёманам ушанавалі памяць расійскага дзяржаўнага дзеяча Пятра Сталыпіна, які з 30 мая 1902-га па 15 лютага 1903 года працаваў на пасадзе гродзенскага губернатара.**

Цырымоніі ўрачыстага адкрыцця памятнай дошкі папярэднічаў «круглы стол» «П.А. Сталыпін — гродзенскі губернатар, рэфарматар Расіі», які адбыўся ў Гродзенскім дзяржуніверсітэце імя Янкі Купалы. Можа, нават у той аўдыторыі, куды заходзіў Пётр Аркадзьевіч як папячыцель былой Марыінскай гімназіі. Сімвалічна і тое, што насупраць гэтага будынка — Свята-Пакроўскі сабор, які быў пабудаваны пры садзейнічанні Сталыпіна. Ён, ужо як старшыня расійскага ўрада, падтрымаў гродзенцаў у іх жаданні ўвекавечыць памяць аб сваіх земляках, загінулых у Маньчжурыі ў гады руска-японскай вайны.

У дыскусіях «круглага стала» ўдзельнічалі пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў, старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён Шапіра, беларускія, расійскія, украінскія і польскія навукоўцы.

Чым яшчэ адметная невялікая гродзенская старонка ў жыцці і дзейнасці Пятра Сталыпіна? Ужо тады ён аддаваў прыярытэт аграрнаму пытанню — выступаў за рассяленне сялян на хутары, пераход ад так званага карыстання зямельнымі надзеламі да хутарской гаспадаркі, ліквідацыю цераспалосіцы, шмат увагі надаваў меліярацыі. Пры гэтым неад'емнай часткай аграрнай рэформы Сталыпін лічыў павышэнне адукацыйнага ўзроўню сялян. Гісторык, прафесар ГрДУ імя Янкі Купалы Валерый Чарапіца прыводзіць фрагмент з дыскусіі на пасяджэнні Гродзенскага таварыства сельскай гаспадаркі. Князь Святаполк-Чацвярцінскі заявіў: «Нам патрэбна рабочая сіла чалавека, патрэбна фізічная праца, а не адукацыя, якая вядзе да дзяржаўнага перавароту, сацыяльнай рэвалюцыі і анархіі». На што губернатар даў рэзкую водпаведзь: «Баяцца граматы і асветы, баяцца святла нельга. Адукацыя народа, правільна і разумна пастаўленая, ніколі не прывядзе да анархіі...»

Па ініцыятыве Пятра Сталыпіна ў Гродне былі адкрыты яўрэйскае двухкласнае народнае вучылішча, рамеснае вучылішча, абсталяванае ўсімі тагачаснымі тэхнічнымі прыладамі, а таксама жаночае прыходскае вучылішча з трэцім прафесійным класам, дзе, акрамя агульнапрынятых прадметаў, яшчэ выкладаліся маляванне, чарчэнне і рукадзелле. Пачалася падпіска на заснаванне імянных стыпендый мужа і жонкі Сталыпіных для найлепшых навучэнцаў Гродзенскай мужчынскай гімназіі.

Як узгадвае дачка Сталыпіна Марыя (па мужу — Бок), з першых дзён губернатарства ў Гродне бацьку сталі даймаць просьбамі аб атрыманні месца, але ён «цяпер не мог хадайніцтваў аб «пратэкцыі», і ні родныя, ні знаёмыя не атрымалі таго, аб чым прасілі, акрамя вельмі рэдкіх выпадкаў, калі былі гэтага сапраўды вартыя».

Пераязджаючы з Прынямоння ў Саратаў (калі атрымаў пасаду саратаўскага губернатара), Пётр Сталыпін пісаў: «Знаходжанне маё тут, у Гродне, было падобна на прыгожы сон. І, як сон, яно было занадта кароткачасовым... Пакідаючы Гродзенскую губерню, я і мая жонка бяром з сабой самыя светлыя ўспаміны...» Ды і не толькі ўспаміны. І ў Саратаве, і пазней ў Пецярбургу разам з сям'ёй Сталыпіных знаходзіліся простыя людзі з прыслугі, звязаныя сваімі каранямі з Гродзеншчынай. Сярод іх была і нянька Людміла Астаньковіч, якая 12 жніўня 1906 года загінула падчас тэракту, закрыўшы сваім целам аднаго з дзяцей Сталыпіных.

Дарэчы, і сёння застаецца загадкай: а ці быў у Гродне помнік Пятру Сталыпіну? Гродзенскі гісторык Валерый Чарапіца спасылаецца на Марыю Бок, дачку Пятра Аркадзьевіча, якая сведчыць у сваіх успамінах, што ўжо праз год пасля гібелі бацькі помнікі яму былі ўстаноўлены ў Кіеве, Гродне і Самары. Іншых дакументальных пацвярджэнняў пакуль не выяўлена, але, верагодна, помнік (ці, можа, невялікі бронзавы бюст?) сапраўды існаваў і быў устаноўлены ў канцы 1911-га — пачатку 1912 года, хутчэй за ўсё, каля губернатарскага палаца альбо ў вестыбюлі.

Калі ў Гродне быў помнік Сталыпіну, то што з ім магло здарыцца? Не выключана, што горад пазбавіўся яго ў верасні 1915 года падчас абарончых баёў рускай арміі і разбурэння кайзераўскімі войскамі артылерыйскім агнём і бамбардзіроўкамі з паветра палаца Тызенгаўза (губернатарскага дома). Заняўшы горад, немцы маглі вывезці помнік (бюст) у Германію. Зрэшты, гэта толькі версія, якая хоць і не абвергнута, аднак пакуль не пацверджана. Можа, гэты помнік і цяпер знаходзіцца ў нейкай замежнай калекцыі?

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**


ДЭПАРТАМЕНТ
ПА КАШТОЎНЫХ ПАПЕРАХ
Міністэрства фінансаў
Рэспублікі Беларусь
**ЗАВЕРАНА**
«08» верасня 2011 г.
Гальперын А.Л.

белагропромбанк
традиции будущего

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
## об открытой продаже облигаций открытого акционерного общества «Белагропромбанк» для юридических лиц сто третьего выпуска

**1. Наименование эмитента:**

открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (ОАО «Белагропромбанк») (далее – Банк);

адкрытае акцыянернае таварыства «Белаграпрамбанк» (ААТ «Белаграпрамбанк»).

**2. Место нахождения Банка, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)**

Местонахождение Банка: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.
Телефон: (017) 229 63 26, факс (017) 229 64 43.
Электронный адрес E-mail: info@belapb.by
УНП 100693551, ОКПО 00040577.

**3. Наименование периодического печатного издания, в котором ежегодно будет публиковаться бухгалтерский баланс, отчет о прибыли и убытках, и сроки их публикации**

Бухгалтерский баланс и отчет о прибыли и убытках Банка ежегодно будет публиковаться в газете «Звязда» не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным.

Бухгалтерский баланс на 1 января 2011 года и отчет о прибыли и убытках за 2010 год опубликованы Банком 30.03.2011 в газете «Звязда» и 31.03.2011 в газете «Рэспубліка».

**4. Размер уставного фонда Банка**

Уставный фонд Банка составляет 5 003 635 046 000 (Пять триллионов три миллиарда шестьсот тридцать пять миллионов сорок шесть тысяч) белорусских рублей.

**5. Депозитарием, обслуживающим Банк,** является Депозитарий ценных бумаг Банка (адрес: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3), действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, регистрационный номер 02200/5200-1246-1085, срок действия лицензии до 18.07.2012.

**6. Дата, номер государственной регистрации Банка и наименование органа, его зарегистрировавшего**

Банк преобразован из Белорусского республиканского банка Агропромбанк СССР учредительной конференцией 11.02.1991 и зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 03.09.1991, регистрационный № 20. Устав Банка утвержден общим собранием акционеров 11.02.1991 (протокол № 1) (с изменениями и дополнениями, зарегистрированными в Национальном банке Республики Беларусь 26.05.2011).

Банк в своей деятельности руководствуется законодательством Республики Беларусь, международными договорами Республики Беларусь, локальными нормативными правовыми актами Банка, а также Уставом Банка.

**7. Сведения о проведении открытой продажи облигаций сто третьего выпуска**

**7.1. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение**

Решение о выпуске облигаций сто третьего выпуска для юридических лиц в соответствии с Уставом Банка утверждено Наблюдательным советом Банка 25.08.2011, протокол № 23.

**7.2. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям**

Выпуск облигаций осуществляются без обеспечения по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь при условии, что общий размер обязательств по таким облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала Банка (подпункт 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28.04.2006 № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг»).

По состоянию на 01.08.2011 нормативный капитал Банка составляет 5 918 724,2 млн. бел. рублей.

**7.3. Выпуск облигаций согласован Национальным банком Республики Беларусь** (постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от 05 сентября 2011 г. № 364).

**7.4. Цель выпуска облигаций**

Выпуски облигаций осуществляются в целях привлечения денежных средств юридических лиц для финансирования реального сектора экономики.

**7.5. Сведения о проведении открытой продажи облигаций сто третьего выпуска**

**7.5.1 Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество и вид облигаций**

Форма выпуска облигаций – бездокументарные.

Объем эмиссии облигаций составляет 50 000 000 000 (Пятьдесят миллиардов) белорусских рублей.

К открытой продаже предлагаются 50 000 (Пятьдесят тысяч) штук процентных облигаций.

Серия ОБ103, номера 000001 – 050000.

Вид облигаций – именные, процентные, неконвертируемые.

**7.5.2. Номинальная стоимость облигации**

Номинальная стоимость облигации – 1 000 000 (Один миллион) белорусских рублей.

**7.5.3. Период проведения открытой продажи облигаций**

Размещение облигаций осуществляется с 03.10.2011 по 02.07.2012 включительно, если иной срок не будет определен Наблюдательным советом Банка.

Размещение облигаций сто третьего выпуска осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**7.5.4. Место и время проведения открытой продажи облигаций**

Размещение (продажа) облигаций Банка производится после согласования Национальным банком Республики Беларусь выпуска облигаций, регистрации в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь выпуска облигаций, опубликования заверенной Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь краткой информации об открытой продаже облигаций сто третьего выпуска.

Первичное размещение облигаций осуществляется на внебиржевом рынке путем открытой продажи в филиалах, отделениях, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка в течение их рабочего времени до момента полной реализации всего объема эмиссии облигаций.

Владельцами облигаций могут быть юридические лица. Юридические лица, изъявившие желание приобрести облигации, обязаны перечислить денежные средства в безналичном порядке с текущих (расчетных) счетов на счет Банка, указанный в договоре.

Продажа облигаций осуществляется по текущей стоимости на дату совершения операции и рассчитывается по формуле:

$$С = Нп + Дн,$$

где:
С – текущая стоимость облигации;
Нп – номинальная стоимость облигации;
Дн – накопленный процентный доход.

В день начала открытой продажи облигаций текущая стоимость облигации равна ее номинальной стоимости.

Начиная со второго дня открытой продажи, покупатель также уплачивает сумму накопленного процентного дохода, рассчитываемую по следующей формуле:

$$Дн = \frac{Нп \times Пд1 \times (\frac{T365}{365}+\frac{T366}{366}) + Нп \times Пд2 \times (\frac{T365}{365}+\frac{T366}{366}) + ... + Нп \times Пдn \times (\frac{T365}{365}+\frac{T366}{366}),}{100}$$

где:
Дн – накопленный процентный доход;
Нп – номинальная стоимость облигации;
Пд1, Пд2, ... Пдn – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, увеличенная на 4,5 (Четыре целых пять десятых) процентных пункта, за соответствующую часть периода начисления дохода, в пределах которого ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной;
Т365 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
Т366 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.

**7.5.5. Срок и порядок обращения облигаций**

Обращение облигаций сто третьего выпуска осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Срок обращения облигаций – 366 календарных дней с 03.10.2011 по 03.10.2012. День начала размещения облигаций и день начала погашения облигаций считаются одним днем.

Совершение сделок купли-продажи облигаций при их обращении осуществляется юридическими лицами на внебиржевом рынке с заключением договора купли-продажи и (или) биржевом рынке в соответствии с порядком, установленным ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (далее – Биржа).

Сделки с облигациями на вторичном рынке прекращаются за два рабочих дня:
- до даты выплаты процентного дохода за каждый период начисления дохода в течение всего срока обращения облигаций;
- до даты погашения облигаций.

**7.5.6. Дата начала погашения облигаций** – 03.10.2012.

**7.5.7. Порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты, период начисления процентного дохода**

Выплата дохода по облигациям производится в виде процентного дохода 1 раз в 3 месяца за истекший период начисления дохода владельцам облигаций, которые указаны в реестре облигаций на дату, предшествующую двум рабочим дням дате выплаты процентного дохода за соответствующий период начисления дохода, а также владельцам облигаций, которые приобрели облигации в период первичного размещения согласно соответствующим договорам после указанного срока формирования реестра до даты выплаты процентного дохода.

Процентный доход выплачивается путем перечисления в безналичном порядке суммы процентного дохода на счет владельца облигации в белорусских рублях в дату окончания соответствующего периода начисления процентного дохода:

| Порядковый номер периода начисления дохода | Начало периода | Конец периода, дата выплаты дохода | Продолжительность периода (дней) |
|---|---|---|---|
| 1 | 04.10.2011 | 03.01.2012 | 92 |
| 2 | 04.01.2012 | 03.04.2012 | 91 |
| 3 | 04.04.2012 | 03.07.2012 | 91 |
| 4 | 04.07.2012 | 03.10.2012 | 92 |
| ИТОГО: | х | х | 366 |

В случае если дата выплаты процентного дохода выпадает на нерабочий день, выплата процентного дохода осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим. Проценты на сумму процентного дохода по облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются. Под нерабочими днями в настоящей Краткой информации понимаются выходные дни, государственные праздники и праздничные дни, являющиеся нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Процентный доход по процентным облигациям за первый период начисления дохода начисляется с даты, следующей за датой начала размещения облигаций по дату его выплаты включительно. День начала размещения облигаций (03.10.2011) и день выплаты дохода за первый период начисления дохода считаются одним днем.

Процентный доход по процентным облигациям за последующие периоды начисления дохода начисляется с даты, следующей за датой выплаты дохода за предшествующий период начисления дохода по дату выплаты дохода за соответствующий период начисления дохода (дату погашения) включительно.

Начисление процентного дохода осуществляется в течение срока обращения облигаций. Со дня истечения срока обращения облигаций процентный доход не начисляется.

Расчет процентного дохода производится путем его начисления на номинал облигации за период начисления дохода, определенный в соответствии с настоящей Краткой информацией, по процентной ставке, равной ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь (с учетом ее изменения), увеличенной на 4,5 (Четыре целых пять десятых) процентных пункта.

Расчет процентного дохода осуществляется по следующей формуле:

$$Дп = \frac{Нп \times Пд1 \times (\frac{T365}{365}+\frac{T366}{366}) + Нп \times Пд2 \times (\frac{T365}{365}+\frac{T366}{366}) + ... + Нп \times Пдn \times (\frac{T365}{365}+\frac{T366}{366}),}{100}$$

где:
Дп – процентный доход по процентным облигациям, выплачиваемый периодически в течение срока их обращения;
Нп – номинальная стоимость облигации;
Пд1, Пд2, ... Пдn – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, увеличенная на 4,5 (Четыре целых пять десятых) процентных пункта, за соответствующую часть периода начисления дохода, в пределах которого ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной;
Т365 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
Т366 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.

В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о банковских реквизитах владельцев облигаций (не представления владельцами облигаций измененных данных о банковских реквизитах), не переоформления счетов «депо» на новых владельцев в соответствии с законодательством Республики Беларусь, а также в иных случаях, установленных законодательством Республики Беларусь, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на соответствующем счете Банка до непосредственного обращения владельцев облигаций (уполномоченных лиц). Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

При обращении владельцы облигаций представляют в Банк письменные заявления с указанием новых (измененных) банковских реквизитов, которые могут быть переданы нарочным (курьером) и (или) с использованием факсимильной связи с последующим обязательным представлением оригиналов заявлений на бумажном носителе.

Выплата причитающейся владельцам облигаций суммы производится не позднее 1 (Одного) рабочего дня после представления Депозитарию ценных бумаг Банка необходимых документов.

Облигации предоставляют владельцу право на получение процентного дохода, а также номинальной стоимости облигаций при их погашении в денежных единицах, в которых выражена их номинальная стоимость. Процентный доход выплачивается только за полностью истекшие периоды начисления дохода.

**7.5.8. Условия и порядок досрочного погашения облигаций**

Наблюдательный совет Банка вправе принять решение о досрочном погашении облигаций сто третьего выпуска либо его части до даты окончания срока обращения:
- неразмещенных в полном объеме эмиссии на момент принятия соответствующего решения;
- неразмещенных не в полном объеме эмиссии (оставшейся части неразмещенных облигаций) на момент принятия соответствующего решения;
- приобретенных Банком в полном объеме эмиссии до даты окончания срока обращения, в порядке указанном в пункте 7.5.11 настоящей Краткой информации;
- приобретенных Банком не в полном объеме эмиссии до даты окончания срока обращения, в порядке указанном в пункте 7.5.11 настоящей Краткой информации.

**7.5.9. Порядок погашения облигаций**

Погашение облигаций производится 03.10.2012 на основании реестра владельцев облигаций. В случае, если дата погашения выпадает на нерабочий день, погашение осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму погашения за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.

В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о банковских реквизитах владельцев облигаций (не представления владельцами облигаций измененных данных о банковских реквизитах), не переоформления счетов «депо» на новых владельцев в соответствии с законодательством Республики Беларусь, а также в иных случаях, установленных законодательством Республики Беларусь, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на соответствующем счете Банка до непосредственного обращения владельцев облигаций (уполномоченных лиц). Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

При обращении владельцы облигаций представляют в Банк письменные заявления с указанием новых (измененных) банковских реквизитов, которые могут быть переданы нарочным (курьером) и (или) с использованием факсимильной связи с последующим обязательным представлением оригиналов заявлений на бумажном носителе. При необходимости переоформления счетов «депо», открытых в депозитарии Банка, владельцы облигаций обязаны предоставить документы, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.

Выплата причитающейся владельцам облигаций суммы производится не позднее 1 (Одного) рабочего дня после представления Депозитарию ценных бумаг Банка необходимых документов.

При погашении облигации владельцу выплачивается в безналичном порядке номинальная стоимость облигаций, а также процентный доход за последний период начисления.

**7.5.10. Дата формирования реестра владельцев облигаций для целей погашения облигаций**

Реестр владельцев облигаций составляется на дату, предшествующую двум рабочим дням дате начала погашения облигаций, указанной в пункте 7.5.6 настоящей Краткой информации (по состоянию на 01.10.2012).

**7.5.11. Условия и порядок приобретения облигаций Банком до даты начала их погашения**

В период обращения облигаций Банк может осуществлять выкуп облигаций у любого их владельца ежеквартально в следующие даты: 03.01.2012, 03.04.2012, 03.07.2012. В случае если дата выкупа облигаций выпадает на нерабочий день, выкуп осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим. Выкуп облигаций осуществляется Банком на внебиржевом рынке на основании договора купли-продажи, заключенного между владельцем облигации и Банком и (или) на биржевом рынке в соответствии с регламентом Биржи, по текущей стоимости на дату выкупа.

Для продажи облигаций Банку владелец облигаций должен:
- не позднее четырех рабочих дней до даты выкупа предоставить в Банк заявление о намерении осуществить такую продажу, которое должно содержать:
наименование владельца облигаций;
наименование ценной бумаги;
количество облигаций, предложенных для продажи;
банковские реквизиты счета для перечисления денежных средств за проданные облигации (в случае если выкуп облигаций осуществляется Банком на внебиржевом рынке);
согласие с условиями приобретения облигаций Банком, которые изложены в настоящей Краткой информации;
юридический адрес (место нахождения) и контактные телефоны владельца;
подпись уполномоченного лица и печать владельца – юридического лица.
- при выкупе облигаций на внебиржевом рынке:
обеспечить в порядке и сроки, определенные соответствующим договором купли-продажи, перевод указанных в заявлении облигаций со счета «депо» владельца – юридического лица на счет «депо» Банка;
при необходимости предоставить в Банк карточку с образцами подписей, заверенную в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
- при выкупе облигаций на биржевом рынке:
не позднее дня выкупа перевести в соответствии с законодательством Республики Беларусь указанные в заявлении облигации на соответствующий раздел своего счета «депо» для участия в торгах на Бирже.

В случае несоблюдения владельцем облигаций сроков предоставления заявления о выкупе и (или) перевода указанных в заявлении облигаций – выкуп облигаций не осуществляется.

Банк имеет право осуществлять в соответствии с законодательством Республики Беларусь:
- продажу приобретенных облигаций Банка;
- иные действия с приобретенными облигациями Банка.

**7.5.12 Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрещении выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь**

В случае запрета выпуска облигаций Банк в месячный срок с момента принятия такого решения Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь возвращает владельцу облигаций денежные средства, полученные в счет оплаты облигаций с уплатой процентов за пользование денежными средствами по ставке процентного дохода, равной ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь (с учетом ее изменения), увеличенной на 4,5 (Четыре целых пять десятых) процентных пункта за текущий период начисления дохода, в котором принято решение о запрете выпуска облигаций.

**8. Дата и номер государственной регистрации облигаций (заполняется Департаментом по ценным бумагам)**

Облигации сто третьего выпуска зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 08 сентября 2011 г., регистрационный номер 5-200-02-1211.

**9. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций)**

С более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций) можно ознакомиться в филиалах, отделениях, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка в течение их рабочего времени.

**Адреса филиалов Банка и телефоны, по которым можно получить справку о продаже облигаций:**

г. Брест, ул. Воровского, 11, тел.: (8-0162) 27-06-61, 27-06-01,
г. Витебск, ул. Димитрова, 31, тел.: (8-0212) 35-00-21, 37-23-14,
г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, тел.: (8-0232) 79-26-89, 79-27-46,
г. Гродно, ул. Советских Пограничников, 110, тел. (8-0152) 52-25-87,
г. Могилев, пр-т Мира, 55, тел. (8-0222) 29-37-50,
г. Минск, пр-т Победителей, 91, тел. (8-017) 209-77-91,
г. Минск, ул. Ольшевского, 24, тел. (8-017) 229-65-35,
г. Минск, пр-т Жукова, 3, тел. (8-017) 218-57-11.

**Первый заместитель Председателя Правления ОАО «Белагропромбанк»** **Н.П. Шевцова**

**И.о. главного бухгалтера ОАО «Белагропромбанк»** **И.А. Медвецкий**

**Телефон Контакт-центра Банка – 136**
8.00–20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

**www.belapb.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551

